

НІКОЛІ НЕЛЬГА СТАВІЦЬ НА САБЕ КРЫЖ 5

ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ДАНЫЯ ПАД АБАРОНАЙ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІСТАПАДА 2021 г. АЎТОРАК № 231 (29600)

## КОРАТКА

- **Зімовая Універсіяда — 2021 адменена з-за новага штаму каранавіруса.**
- Нацбанк вызначыў пералік сістэмна значных банкаў на 2022 год.
- **Снежань сёлета чакаецца цяплейшы чым звычайна.**
- Больш за 300 пацярпелых ад галалёдных і халадовых траўмаў зарэгістравана ў Беларусі за два тыдні.
- **Адноўлены аўтобусны рух па маршруце Гродна — Варшава.**
- «Магілёўліфтмаш» распрацаваў двухузроўневую сямейную паркоўку на два аўтамабілі.

З першых вуснаў

# «Мы небагатая краіна, але нам чужое багацце і чужыя тэрыторыі не патрэбныя»




Фота БелТА.

**Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях ваеннай бяспекі ў Цэнтры стратэгічнага кіравання Міністэрства абароны ў беларускай сталіцы. Падчас сустрэчы Аляксандр Лукашэнка паставіў задачы ваенным у часы асаблівай нестабільнасці на граніцы, абмеркаваў з імі меры супрацьдзеяння ў выпадку магчымых ваенных дзеянняў і расказаў, чый бок зойме наша краіна, калі разгорнецца канфлікт паблізу Беларусі.**

### За гэтым нешта стаіць

Размову з ваеннымі Прэзідэнт пачаў з заўвагі: падзеі, што разгортваюцца ў Чарнаморскім басейне, пытанні, звязаныя з Украінай, Польшчай і краінамі Балтыі, аўтаномна, незалежна ад Беларусі разглядаць нельга.

«Мы — звяно ў гэтым агульным ланцугу. Мы яшчэ не да канца ведаем, але ўяўляем задуму нашых праціўнікаў, сёння шчыра можам сказаць, нашых ворагаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, сталі часцей лятаць над Калінінградскай вобласцю самалёты-разведчыкі, у сумежных з Беларуссю краінах праходзяць маштабныя ваенныя вучэнні. СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ГУСЕЎ, дырэктар Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Дзяржстандарта:**

*«Сёлета ў Беларусі вядзецца будаўніцтва больш за восем тысяч аб'ектаў рознага прызначэння. Трэць з іх — гэта жыллё. Больш за 15 працэнтаў — сацыяльна-культурныя аб'екты. У зоне нашай увагі таксама аб'екты прамысловага, сельскагаспадарчага прызначэння, дарожнага будаўніцтва і іншыя. У гэтым годзе інспекцыямі дэпартамента ўстаноўлены парушэнні на 70 працэнтах аб'ектаў, якія будуюцца ў краіне. У структуры значных парушэнняў 65 працэнтаў дэфектаў выяўлена ў арганізацыі будаўнічай вытворчасці, аддзелачных работах, запаўненні аконных і дзвярных праёмаў, работах па ўладкаванні падлог, драўляных і ізаляцыйных канструкцыях, добраўпарадкаванні тэрыторый».*

# На рэкордным полі



Атрад трактарыстаў ААТ «Гастэлаўскае» Мінскага раёна, пакуль снежнае покрыва не ахутала палеткі, вывозяць і ўносяць арганіку пад будучы ўраджай, заворваюць. Гэты здымак зроблены на полі, якое сёлета стала рэкордным: пшаніцы тут намалацілі звыш ста цэнтнераў на гектар. А вясною на ім будуць пасеяны цукровыя буракі. Дырэктар прадпрыемства Станіслаў САКАЛОЎСКІ *(на здымку ён злева)* з трактарыстамі Сяргеем МЫШКАЎЦОМ і Валерыем МОТУСАМ абыходзяць апрацаванае поле і правяраюць якасць зробленага.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Простыя рэчы

# НЕ ЗДАЦЦА Ў ПАЛОН УЗРОСТУ

## Як палепшыць якасць жыцця пажылых людзей?

**Па звестках на гэты год, у Беларусі пражывае каля 1,5 мільёна пажылых людзей, старэйшых за 65 гадоў. Паводле прагнозу, у 2030-м іх колькасць пераўзысціць два мільёны. Пажылыя людзі нярэдка маюць сардэчна-сасудзістыя хваробы, праблемы з апорна-рухальным апаратам, кагнітыўныя расстройствы, такія як зніжэнне памяці і працаздольнасці, пакутуюць ад псіхічных расстройстваў, у прыватнасці дэменцыі. Як вядома, людзі сталага веку больш цяжка пераносяць і COVID-19, а наступствы ад гэтага захворвання могуць істотна пагаршаць іх стан здароўя. На Міжнародным семінары «Сярэбраны анлайн-форум: псіхічнае здароўе і сацыяльны дабрабыт» спецыялісты з розных галін расказалі, што дапамагае палепшыць якасць жыцця пажылых людзей, як знайсці ў їм сэнс і вярнуць цікавасць. Аказваецца, заставацца ў страі часам дапамагаюць самыя простыя рэчы: падтрымліваць гігіену, рэгулярна харчавацца, выконваць элементарныя практыкаванні.** СТАР. 9

ISSN 1990 — 763X

21231

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**



# «Мы небагатая краіна, але нам чужое багацце і чужыя тэрыторыі не патрэбныя»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Як заяўляе міністр абароны Расіі, дзясяткамі самалётаў здзяйсняецца аблёт расійскіх граніц і трэніруецца бомбакіданне. Прама было заяўлена, што адпрацоўваецца ядзерны ўдар па Расіі. Калі на сумежных тэрыторыях будуюцца ракадныя дарогі і масава праводзяцца вучэнні з перакідваннем дадатковых войскаў да нашай граніцы (іх ужо дзясяткі тысяч), гэта не дарэмна. За гэтым нешта стаіць», — дадае кіраўнік краіны.

Ён падзяліўся з ваеннымі сваімі разважаннямі наконт гэтага. Паводле Аляксандра Лукашэнкі, праціўнікі спрабуюць «пастроіць Расію» і вылучылі тэзіс, што яна нібыта рыхтуецца нападаць на Украіну: «Пачынаючы актыўныя рухі вакол Расійскай Федэрацыі пад прыкрыццём таго, што яна збіраецца напасці на Украіну. У мяне такіх звестак аб нападзенні няма. Калі б такія задумы былі, то беларускія ваенныя, і я ў тым ліку, пра гэта б ведаў».

Як дадаў Прэзідэнт, калі будзе зноў развязана вайна на Данбасе ці на граніцы з Расіяй, Беларусь не застанецца ўбаку і вядома, каго падтрымае.

«Яны гэта разумеюць. І Украіна пачала ўмацоўваць сваю паўночную граніцу. Хоць для гэтага ніякіх фактаў, прычын для ўзмацнення беларуска-ўкраінскай граніцы сёння няма. Там абсалютная цішыня. Нават спакайней, чым было раней», — канстатуе кіраўнік дзяржавы.

## Порах трымаць сухім

Прэзідэнт разважае: краіны-суседкі на Захадзе, верагодна, турбуюцца, што плынь мігрантаў паменшылася — гэтых людзей яны выкарыстоўвалі для вырашэння сваіх унутраных праблем і напружання Беларусі.

«Яны выдатна разумеюць, што калі Украіна паспрабуе развязаць канфлікт з Расіяй, убаку Беларусь не застанецца. Таму беларускую армію неабходна стрымліваць, напружваць на заходніх граніцах — Латвія, Літва, Польшча і на поўдні — узмацненне ўкраінскай граніцы. Паглядзіце, у найбліжэйшы час усё, што я сказаў, будзе пацверджана», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Раней ім была дадзена каманда кіраўнікам сілавога блока ні ў якім разе не паддавацца на правакацыі і самім не правакаваць канфлікты. Але ў той жа час, дадае Прэзідэнт, міністру абароны Віктару Хрэніну і Генштабу было даручана падрыхтаваць планы магчымага адказу на агрэсію і супрацьпраўныя дзеянні з парушэннямі граніцы Беларусі.

«Генштаб кожны раз павінен памятаць, па якіх кірунках гэтыя мярзотнікі будуць дзейнічаць супраць нас і як мы на гэта будзем рэагаваць», — акцэнтуе кіраўнік краіны.

Ён нагадаў, што яго прасілі падтрымаць стварэнне сіл хуткага рэагавання, якія будуць задзейнічаны на працягу 2-3 гадзін і дастаўлены ў любы пункт Беларусі.

«Усё, на што мы былі здольныя і нават не здольныя ў фінансавых адносінах, мы для арміі імкнуліся зрабіць. Таму мэта нашай сённяшняй нарады ў гэтым цэнтры — магчымае рэагаванне Узброеных Сіл (то-бок не толькі арміі, але і МУС, пагранічных войскаў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі) на магчымыя несяброўскія, агрэсіўныя крокі ў напрамку Беларусі», — тлумачыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падсумаваў свае тэзісы: мы не разгортваем свае воінскія падраздзяленні, але планы супрацьдзеяння павінны быць нават на задуму варожых узброеных сіл.

## «Следчыя разбяруцца»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: даўно заяўляў, што супраць Беларусі разгорнута гібрыдная вайна па ўсіх кірунках, дайшлі нават да гарачага супрацьстаяння.

«Мы не ведаем, што яны нам падкінуць. Ці маглі мы прадказаць, што ў нас узнікне нейкі міграцыйны крызіс? Мы ж пра гэта нават не думалі, але ён узнік і падаграваецца пастаянна», — кажа Прэзідэнт.

Ён заяўляе, што ў гэтым міграцыйным крызісе дайшло да забойства людзей. Так, пазаўчора, кажа Аляксандр Лукашэнка, падкінулі труп па беларускую граніцу, учора ноччу знойдзены яшчэ адзін. «Той жа почырк. У спальны мяшок змяшчаюць мёртвага ці паўмёртвага чалавека і выкідваюць. Пагранічнікі знаходзяць ужо без дыхання. Учора знайшлі траіх чалавек на хутары пагранічнікі. Калі знайшлі труп, убачылі тры мяшкі спальныя. Пачалі пошук. Генерал Лапо (Анатоль, старшыня ДПК. — **«Зв.»**) мне далажыў, што знайшлі абмарожаных», — расказвае Прэзідэнт.

Бежанцы размясціліся ў закінутым доме, яны ўжо не маглі ісці. «Паўзлі. Некалькі соцень метраў прапаўзлі, знайшлі хату. Напэўна, ужо і мясцовыя жыхары дапамаглі, печку распалілі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Яшчэ адна ноч, і трэба было б ампутаваць ногі, калі б жывых знайшлі. Гэта на літоўскай граніцы».

Па яго словах, забойствы людзей і выкідванне целаў на нашу граніцу сталі новіцца акцыяй. «Што за гэтым стаіць? Я думаю, следчыя разбяруцца», — дадае Аляксандр Лукашэнка.

## «Усё робіцца для разбурэння Еўрапейскага саюза»

Прэзідэнт абмеркаваў з ваеннымі і лёс ЕС. Ён акцэнтаваў увагу на візіце прэм'ер-міністра Польшчы Матэуша Маравецкага ў Вялікабрытанію.

«Вось паглядзіце, на працягу года-двух яны хочуць з падачы Амерыкі разбурыць Еўрапейскі саюз. Амерыканцам не патрэбны партнёры, што могуць стаць роўнымі з імі. Як толькі еўрапейцы ўвялі сваю валюту (еўра), а гэта пагражае долару, так пачаліся праблемы ў Еўраатлантычным блоку», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Ён сцвярджае, што невыпадкова Вялікабрытанія выйшла з ЕС, а зараз такая стаўка робіцца на Польшчу.

«З іх ужо нехта пачынае заяўляць: закончацца датацыі з Еўрасаюза ў мільярды еўра, нам Еўрасаюз не патрэбны. Таму ўсё робіцца для разбурэння Еўрапейскага саюза», — мяркуе кіраўнік краіны.

## Адэкватны адказ

Прэзідэнт заяўляе, што ў такой абстаноўцы неабходна абараніць краіну. «Я не драматызую падзеі, але ваенных папярэджваю. На любы магчымы іх рух у нас павінен быць адэкватны адказ. Вось ваша задача. І папярэджваю: не дай бог, калі ў вас будзе нейкі фармалізм», — падкрэслівае кіраўнік краіны.

Ён адзначае, што ваенныя павінны дакладна разумець, як будуць дзейнічаць у надзвычайным выпадку. Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка атрымаў ад Прэзідэнта даручэнне выкарыстаць любую магчымасць для падтрымання арміі.

«Я запрасіў сюды міністра ўнутраных спраў, кіраўніка нашай пагранічнай службы, старшыню камітэта. Вы павінны разумець: мы людзі ваенныя. Не дай бог, нешта здарыцца — мы бяром зброю ў рукі. Павінен вам сказаць, што ў сістэме ўнутраных спраў падрыхтаваных хлопцаў не менш, чым у арміі», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка. Папрасіў ён не забываць і пра войскі тэрытарыяльнай абароны, якія з'яўляюцца годным рэзервам.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу далажыць, як будуць рэагаваць на вучэнні ва Украіне пад назвай «Палессе». Але падкрэсліў: «Мы не бразгаем зброяй. Мы разумеем, што такое вайна. Многія з нас перажылі нягоды пасляваенных гадоў, калі галодныя, раздзетыя з зямлянак не маглі вылезці. Цяпер жывём прымальна. Мы не хочам ніякіх войнаў. Мы небагатая краіна, але нам чужое багацце і чужыя тэрыторыі не патрэбныя. Дай бог асвоіць гэтую зямлю». Але, калі да нас прыйдуць са зброяй, беларусам ёсць чым адказаць.

Пасля кіраўніка краіны слова ўзяў міністр абароны Віктар Хрэнін. Як ён далажыў, ведамства пастаянна праводзіць ацэнку ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол Беларусі і шукае аптымальныя варыянты ўзмацнення бяспекі краіны.

«Вынікі ацэнкі паказваюць, што меры, якія прымаюць краіны Захаду па мілітарызацыі рэгіёна, вядуць да істотнага змянення балансу сіл. Паблізу граніц нашай краіны нарошчваецца наступальны патэнцыял узброеных сіл краін-членаў блока НАТА. Разгортваюцца новыя ваенныя фарміраванні, закупляюцца сучасныя прыклады ўзбраення. У Польшчы фарміруецца 18-я механізаваная дывізія і брыгады тэрытарыяльнай абароны. Частка з іх — паблізу нашай дзяржаўнай граніцы», — паралічвае міністр.

Асабліву заклапочанасць ваенных выклікае закупка сумежнымі краінамі танкаў «Абрамс», ЗРК «Пэтрыёт», РСЗА «Хімарс», баявых самалётаў Ф-35, аснашчаных крылатымі ракетамі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• Каментарый у тэму**

Ужо ў размове з журналістамі **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** паведаміў, што прыярытэтнымі кірункамі ў нацыянальнай абароне з'яўляюцца комплексная падрыхтоўка войскаў сумесна з Расіяй да адбіцця пагроз, мерапрыемства на сярэднетэрміновую перспектыву па прыкрыцці паўднёвага напрамку, удасканаленне адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны Беларусі і Расіі.

Па словах міністра, у будучым годзе маштабныя вучэнні не адбудуцца, але ў планах — трэніроўкі па прыкрыцці паўднёвых граніц з Расійскай Федэрацыі.

Віктар Хрэнін адзначыў, што прыцягванне суседнімі краінамі сіл тэрытарыяльнай абароны вядзе да павышэння ваеннай актыўнасці.

«Мы не плануем у сённяшніх умовах прыцягваць нашу тэрытарыяльную абарону, бо ёсць дакладныя задачы, для чаго яны ў нас прызначаныя і ў якім выпадку будуць прымяняцца. Але яны ў нас ёсць: зладжаныя, укамплектаваныя і забяспечаныя, у гэтым можаце не сумнявацца», — канстатаваў кіраўнік ваеннага ведамства.

Ён адзначыў, што гэтым часам ваенныя ніякіх дадатковых мерапрыемстваў па прывядзенні ў найвышэйшую ступень гатоўнасці Узброеных Сіл не праводзяць.

«Але на любыя неадэкватныя дзеянні мы робім план, які закладваем на выпадак неабходнасці», — сказаў Віктар Хрэнін.

Парламенцкі дзённік

# Пытанні бяспекі — харчовай і не толькі

**Учора ў Авальнай зале Дома ўрада прайшло сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Галоўнай яго тэмай было развіццё і павышэнне эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу, але былі закранутыя і іншыя важныя для парламента і краіны ў цэлым пытанні.**

У прыватнасці, гаворачы аб прыняцці рэспубліканскага бюджэту на наступны год, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** адзначыў, што парламентарыі павінны быць гатовыя прыняць яго аператыўна пасля разгляду дакумента ў кіраўніка дзяржавы.

Не абышоў спікер ніжняй палаты парламента ў сваім выступленні і іншыя надзённыя тэмы. Парламентарыям неабходна аператыўна рэагаваць на ўсе недружалюбныя выпады супраць краіны, адзначыў ён: «Неабходна пастаянна сачыць за сітуацыяй на граніцы, даводзіць да міжнароднай супольнасці інфармацыю аб сапраўдным стане спраў». «Асаблівую занепакоенасць выклікае тое, што развязаная супраць беларускага народа інфармацыйная вайна паступова набывае формы ваеннага процістаяння. Пад выглядам штучна створанага звонку міграцыйнага крызісу адбываецца нарошчванне войскаў НАТА каля нашых заходніх граніц. Пры гэтым краіны, якія заўсёды на словах выступалі за дэмакратыю і правы чалавека, сёння, не раздумваючы, прымяняюць сілу і зброю супраць мірных грамадзян, цякарных жанчын, дзяцей і старых. Вось такое разуменне дэмакратыі яны ўсяляк стараюцца навязаць і нам», — адзначыў спікер.

Што датычыцца асноўнай тэмы сумеснага пасяджэння, дакладчыкам выступіў **віцэ-прэм'ер, які адказвае ва ўрадзе за сферу АПК, Аляксандр СУБОЦІН.** Паводле яго слоў, у сельскай гаспадарцы па большасці паказчыкаў прагнозы бягучага года вышэйшыя за сярэднія па пяцігодцы. «Так, валавы збор збожжавых і зернебабовых у вазе пасля дапрацоўкі ў сярэднім за пяць гадоў у сельскагаспадарчых і фермерскіх арганізацыях склаў 7332 тысячы тон, у 2021 годзе мы атрымалі 7460 тысяч тон, або 102 працэнты да сярэдняга за пяць гадоў. У тым ліку вытворчасць рапсу ў бягучым годзе склала 720 тысяч тон, або 138 працэнтаў да сярэдняга за пяцігодку», — адзначыў ён. У параўнанні з мінулым годам павялічылася вытворчасць малака, больш сабрана кукурузы на зерне і цукровых буракоў. «За 10 месяцаў бягучага года пры існуючых сыравінных рэсурсах у цэлым па краіне тэмп росту вытворчасці прадуктаў харчавання і напояў склаў 101,8 працэнта да такога ж перыяду 2020 года», — дадаў Аляксандр Субоцін.

У рэйтынгу глабальнай харчовай бяспекі Беларусь у 2020 годзе заняла 23-е месца ў свеце са 113 краін, пры гэтым у 2019 годзе займала 36-ю пазіцыю. Высока ацэнена наяўнасць нацыянальных праграм і развіццё нарматыўна-прававых дакументаў у галіне якасці і бяспекі прадуктаў харчавання (26-я пазіцыя ў свеце і 18-я ў Еўропе).

«Для задавальнення патрэб унутранага рынку пераважна за кошт уласных рэсурсаў склаўся дастатковы ўзровень вытворчасці па такіх таварных пазіцыях, як малако (256 працэнтаў ад унутраных патрэб), цукар (больш за 176 працэнтаў), алей (больш за 232 працэнты), мяса (каля 135 працэнтаў), яйкі (126 працэнтаў), збожжа (107,5 працэнта), бульба і агародніна (больш за 100 працэнтаў). Недастатковы ўзровень самазабеспячэння традыцыйна адзначаецца па рыбе (12 працэнтаў), фруктах і ягадах (67 працэнтаў)», — праінфармаваў віцэ-прэм'ер.

Па шэрагу відаў сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання ў Беларусі ў разліку на аднаго чалавека вытворчасць у некалькі разоў большая, чым у дзяржавах — членах ЕАЭС. У 2020 годзе ў краіне на душу насельніцтва было атрымана амаль 600 кг бульбы і 828 кг малака (больш чым у Расіі і Арменіі).

«Але чым больш інтэнсіўна ідзе развіццё галіны, тым вастрэй адчуваецца неабходнасць удасканалення адносін у сельскагаспадарчай вытворчасці, фарміравання новых эфектыўных метадаў і мадэляў развіцця», — рэзюмаваў Аляксандр Субоцін.

Таксама віцэ-прэм'ер адзначаў, што прадпрыемствы АПК правялі каласальную працу па дыверсіфікацыі экспартных паставак. Геаграфія экспарту харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны — 104 краіны свету.

У размове з журналістамі пасля пасяджэння Аляксандр Субоцін закрануў і тэму санкцый. «Як паказвае практыка, усё ж харчаванне і медыцына ніколі не падпадалі пад санкцыі. Думаю, усё ж застанецца розум такія рэчы не чапаць», — сказаў ён, пры гэтым адзначыўшы: «Свет не замыкаецца на адным Захадзе. Ёсць Усход, ісламскі свет, Кітай. Ёсць нашы браты ў Расіі, іншыя краіны СНД, а таксама Афрыка, Паўднёвая Амерыка. Мы ў любым выпадку ідзём на ўсе рынкі, а гандляваць будзем там, дзе выгадна».

**Паводле БелТА.**

Нацыянальны інтарэс

# ЗМЕНЫ, ПРАДЫКТАВАНЫЯ ЧАСАМ

## Работа над праектам абноўленай Канстытуцыі практычна падышла да фіналу


Фота БелТА.

**Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. «Мы выйшлі на праект Канстытуцыі, але, тым не менш, чакаецца яшчэ нязначная дапрацоўка, дашліфоўка па асобных пазіцыях», — сказаў Ігар Сергеенка.**

Паводле яго слоў, работа над абноўленым варыянтам Асноўнага Закона краіны мела даволі напружаны характар. «Пастаянныя дыскусіі, спрэчкі, кансультацыі. Сёння мы можам сказаць, што змяненні закранулі практычна ўсе раздзелы. Прынцыповыя дапаўненні і змяненні ўнесены ў 77 артыкулаў, з'явілася 11 новых і прапаноўваецца новая глава, якая будзе раскрываць статус, паўнамоцтвы, кампетэнцыі Усебеларускага народнага сходу», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

У прэамбуле Канстытуцыі змяненні нязначныя. «Тым не менш прэамбула дапоўнена палажэннямі аб захаванні нацыянальнай самабытнасці, суверэнітэту, духоўных і культурных традыцый Беларусі. Сёння тэма беларускай ідэнтычнасці мае актуальнае гучанне. Лічу, што ў працэсе ўсенароднага абмеркавання палітолагамі, крытыкамі, гісторыкамі прэамбула можа быць дапоўнена», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

### УНС як стабілізацыйная сіла

«Усебеларускі народны сход па праекце Канстытуцыі — гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя. І ў раздзеле дастаткова падрабязна распісаны паўнамоцтвы УНС, як будуць выбірацца яго дэлегаты. Дарэчы, у гэтай частцы яшчэ патрэбна невялікая дапрацоўка ў плане выбару дэлегатаў на мясцовым узроўні. Меркаванні тут не зусім супалі. Думаю, на працягу тыдня мы гэта дапрацуем», — сказаў Ігар Сергеенка.

Паводле яго слоў, Усебеларускі народны сход будзе сфарміраваны на дэмакратычных прынцыпах і павінен стаць стабілізацыйнай сілай у адносінах паміж усімі галінамі ўлады. «Тым больш у склад дэлегатаў у нас будуць уваходзіць прадстаўнікі выканаўчай, заканадаўчай, судовай галін улады, а таксама прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці. Адпаведна, УНС надзяляецца істотнымі паўнамоцтвамі — вызначаць і зацвярджаць стратэгічныя кірункі развіцця нашай краіны, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка падкрэсліў: рашэнні УНС будуць абавязковымі для ўсіх органаў і грамадзян. «УНС, мяркуецца, будзе надзелена правам адмяняць рашэнні іншых органаў, калі гэтыя рашэнні супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі нашай краіны. Мяркуем, што яшчэ асобныя дапаўненні, якія прапісаны і датычацца прызначэння кіраўніцтва і суддзяў Канстытуцыйнага Суда, Вярхоўнага Суда, Цэнтральнай выбарчай камісіі таксама знойдуць адлюстраванне ў паўнамоцтвах УНС», — дапоўніў ён.

Пры фарміраванні паўнамоцтваў УНС зыходзілі з прынцыпу, што ў краіне не павінна быць двоеўладдзя. «Наша дзяржава застаецца прэзідэнцкай рэспублікай, і, адпаведна, найвышэйшай службовай асобай з'яўляецца Прэзідэнт. Мяркуецца, што ў новым праекце знойдуць адлюстраванне змены ў некаторых артыкулах, якія закранаюць патрабаванні да кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта. Гэтыя патрабаванні будуць крыху больш жорсткія. Плануецца ўвядзенне абмежаванняў па тэрмінах для кіраўніка дзяржавы — не больш як два тэрміны. Таксама плануецца змяніць працэдуру імпічменту. З улікам паўнамоцтваў УНС гэтая працэдура будзе відазменена, у некаторай ступені можа быць нават некалькі спрошчана, — растлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Калі гаварыць аб ролі парламента, то ён атрымлівае пэўныя дадатковыя функцыі кантралявання. Гэта заслухоўванне шэрагу вышэйшых службовых асоб — генеральнага пракурора, старшыні Камітэта дзяржкантролю, кіраўніка Нацбанка. Парламент будзе працаваць ужо не дзве сесіі: вясновую і восеньскую, а практычна цэлы год. Тэрмін дзеяння парламента плануецца павялічыць да пяці гадоў».

Далейшае развіццё атрымаюць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, клопат аб інвалідах, ветэранах, моладзі. «Разам з тым прапануецца ўвесці і сацыяльную адказнасць грамадзян перад грамадствам і дзяржавай. Не толькі пашырэнне правоў. Павінны быць і абавязкі. Канстытуцыя — гэта не набор ільгот, гэта шэраг гарантый, якія прадастаўлены нашым грамадзянам», — канстатаваў Ігар Сергеенка.

### Пасыл замежным партнёрам

«Мяркуецца дапоўніць арт. 18: Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў адносінах да іншых дзяржаў. Гэта сведчыць аб міралюбівым характары беларускай знешняй палітыкі, і гэта пасыл, вядома, нашым знешнім партнёрам», — сказаў Ігар Сергеенка.

Таксама будзе адлюстравана яшчэ адна з пазіцый з улікам развіцця атамнай энергетыкі — выкарыстанне атамнай энергетыкі ў мірных мэтах. «Вы бачыце сёння, якую хвалю ўзнімае Літва ў першую чаргу, іншыя краіны. І мы вырашылі гэту пазіцыю таксама адлюстраваць, што наша энергетыка развіваецца толькі ў мірных мэтах, і станцыя развіваецца бяспечна», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

### ЦВК: новая назва і паўнамоцтвы

«Цэнтральная выбарчая камісія, мяркуем, атрымае новую назву. І ў Канстытуцыі прапісаны паўнамоцтвы Цэнтральнай выбарчай камісіі: якія выбарчыя кампаніі арганізуе, у тым ліку і выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, адпаведна, парламенцкія, прэзідэнцкія, выбары ў мясцовыя саветы. Правы вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, плануецца, нараўне з працоўнымі калектывамі і грамадзянамі ў адпаведнасці з законам будзе дадзена палітычным партыям. Гэта значыць, пэўныя змены. Адзіны дзень галасавання — рашэнне ўжо прынята адпаведным законам», — сказаў Ігар Сергеенка.

Пашыраны паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда. «Канстытуцыйны Суд будзе правяраць канстытуцыйнасць усіх пытанняў, якія выносяцца на рэферэндум, а таксама ацэньваць канстытуцыйнасць правядзення выбараў у парламент і выбараў Прэзідэнта. І з'яўляецца новая форма — гэта падача грамадзянінам непасрэдна скаргі ў Канстытуцыйны Суд. І Канстытуцыйны Суд мае права разгледзець і даць адказ канкрэтнай асобе па тым ці іншым пытанні», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

### Усенароднае абмеркаванне

«Я думаю, што ў першай палове снежня мы зможам азнаёміцца з праектам абноўленай Канстытуцыі, калі прыйдзем да канчатковага рашэння літаральна па некалькіх пазіцыях, якія прагучалі на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы. І я ўпэўнены, што далейшая праца над Канстытуцыяй будзе працягнута ўжо на пляцоўках у ходзе ўсенароднага абмеркавання», — сказаў Ігар Сергеенка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта заклікаў беларусаў узяць актыўны ўдзел у абмеркаванні праекта Канстытуцыі. «Таму што на гэтым этапе таксама могуць паступіць прапановы, якія будуць заслугоўваць увагі. Мы будзем іх улічваць у сваёй рабоце для таго, каб канчаткова па выніках усенароднага абмеркавання выйсці на Канстытуцыю, каб яна захавала сацыяльна арыентаваную накіраванасць з апорай на моцную дзяржаву, на моцныя традыцыі, якія існуюць у нас у краіне», — канстатаваў ён.

**Паводле БелТА.**

Кантэкст

# АЗВЯРЭЛЫЯ ПАДОНКІ

## Літоўскія ўлады страцілі чалавечае аблічча

**Мінулыя выхадныя на беларуска-літоўскай граніцы сталі насамрэч смяротнымі. 27 лістапада на ўчастку пагранічнай заставы «Відзы» Полацкага пагранічнага атрада знойдзены труп мужчыны афра-азіяцкай знешнасці ўзростам каля 30 гадоў, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце Беларусі. «Выкінутае літоўскімі сілавікамі цела збітага бежанца ў спальным мяшку без прыкмет жыцця знаходзілася непасрэдна на літоўска-беларускай граніцы», — адзначылі ў ДПК. Для ўстанаўлення абставін і прычын смерці на месца здарэння была выклікана следча-аператыўная група. Следчыя праводзяць праверку па факце выяўлення цела бежанца, паведамілі ў Следчым камітэце.**

Пагранічнікі аказалі дапамогу бежанцам-суайчыннікам загінулага на граніцы. «Недалёка ад месца выяўлення трупа падчас пошукавых мерапрыемстваў у пагранічнай зоне былі знойдзены яшчэ трое грамадзян, са слоў, Шры-Ланкі, без дакументаў. Усе яны знаходзіліся ў вельмі змардаваным стане з прыкметамі абмаражэння ног. Бежанцы расказалі, што іх было чацвёра разам з загінулым мужчынам. «Знаходзячыся на тэрыторыі Літвы, яны падвяргаліся збіванням з боку літоўскіх сілавікоў. Таксама іх палохалі і нацкоўвалі на іх службовых сабак. Наступствы такога «гуманнага» стаўлення — шматлікія траўмы і скаргі на несуцішальны боль», — расказалі ў ДПК.

Беларускія пагранічнікі аператыўна аказалі дапамогу на месцы і выклікалі брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі. Пасля агляду медыкамі было прынятае рашэнне аб шпіталізацыі замежных грамадзян у Браслаўскую цэнтральную раённую бальніцу.

«Літоўскія сілавікі не толькі пазбаўляюцца ад жывых бежанцаў, пагражаючы ім расправай, але і цынічна выкідваюць праз граніцу ўжо мёртвых», — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.** Ён расказаў пра чарговую смерць бежанца. 28 лістапада на беларуска-літоўскай граніцы пагранічным нарадам знойдзены труп збітага і знясіленага мужчыны неславянскай знешнасці. Пры аглядзе мясцовасці выяўлены сляды валачэння цела бежанца праз граніцу з тэрыторыі Літвы. «Гэта ўжо шостая ахвяра цынічнай і бесчалавечнай палітыкі, што праводзіцца Літвой і Польшчай у адносінах да людзей, якія знаходзяцца ва ўразлівым становішчы, выяўленая на граніцы з Еўрасаюзам», — адзначылі ў ДПК.

Для ўстанаўлення абставін здарэння і прычын смерці была выклікана следча-аператыўная група. Следчымі з удзелам спецыялістаў упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гродзенскай вобласці праведзены агляд месца здарэння, зафіксавана следавая карціна, у тым ліку сляды валачэння з сумежнай тэрыторыі, паведамілі ў Следчым камітэце.

З месца здарэння канфіскаваны прадметы адзення і побыту, сярод якіх прадукты з літоўскай маркіроўкай, што сведчыць аб яго знаходжанні напярэдадні на тэрыторыі сумежнай дзяржавы. Якіх-небудзь дакументаў, што сведчаць асобу мужчыны, не знойдзена. Цяпер для вызначэння канкрэтнай прычыны смерці мужчыны назначана судова-медыцынская экспертыза. Усе абставіны здарэння ўстанаўліваюцца ўпраўленнем Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці ў рамках праверкі.

«Улады Літвы страцілі чалавечае аблічча. Два дні запар перацягваюць на беларускую тэрыторыю забітых бежанцаў. Збітых, забітых сілавікамі ў Літве. Гэта трэба фіксаваць і прад'яўляць абвінавачанні ў злачынствах супраць чалавечнасці. Азвярэлыя падонкі», — справядліва заўважыў у сваім тэлеграм-канале палітолаг Аляксей Дзермант.

У еўрасаюзаўскіх функцыянераў іншае меркаванне. У нядзелю ў Вільнюс прыбылі генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг і старшыня Еўрапейскай камісіі Урсула фон дэр Ляен. «Літва гуманна і рашуча спраўляецца з гэтым крызісам. ЕС працягвае падтрымліваць вас у гэтых намаганнях», — адзначыла кіраўнік Еўракамісіі, паведаміла Delfi. Пра «гуманныя намаганні» чытайце вышэй...

«Свет убачыў галоўную ролю Польшчы і Прыбалтыкі ў НАТА і Еўрасаюзе — гэта «пераапранутыя» нацысты, якія ўвасабляюць палітычны тэатр абсурду калектыўнага Захаду», — такое меркаванне БелТА выказаў **загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН.** Як лічыць эксперт, разбуральны парадак дня Захада аказаўся затратным і тупіковым. «Урсула фон дэр Ляен змагла знайсці 200 мільёнаў еўра на ўзвядзенне сцяны польска-прыбалтыйскага гета, што ў прынцыпе з'яўляецца падтрымкай высокага градуса ваенна-палітычнай істэрыі», — заўважыў Мікалай Шчокін.

Нават масавыя смерці бежанцаў на граніцах Еўрасаюза нічога не мяняюць у крывадушнай палітыцы дзяржаў Захаду. Аб гэтым у эфіры «Альфа Радыё» заявіў **старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** Ён звярнуў увагу, што дагэтуль ні літоўская, ні польская ўлады не паспрабавалі выпрацаваць механізм, які б выключыў такія смерці ў будучыні. «Кожная такая смерць усё ж уплывае на тое здаровае грамадства, якое ёсць у Літве, Латвіі, Польшчы, Германіі. Мы бачым шматлікія дэманстрацыі пратэсту, у тым ліку ў Германіі. Я спадзяюся на тое, што грамадзянскі гуманістычны інтэрнацыянал дапаможа вырашыць гэтую праблему, калі ўжо ўлады ў Літве і Польшчы не ў стане гэта зрабіць», — адзначыў Андрэй Крывашэеў.

Тым часам у Германіі, куды так імкнуцца трапіць бежанцы, прайшла акцыя ў знак салідарнасці з людзьмі, якія знаходзяцца на граніцы, паведаміла Euronews. Удзельнікі акцыі размясцілі перад будынкам Бундэстага шэсць тысяч зялёных агнёў і надпіс «Прыняць зараз». Такім чынам яны імкнуцца прыцягнуць увагу ўлад да катастрафічнай сітуацыі з бежанцамі ў рэгіёне.

«Адзінае вырашэнне сітуацыі залежыць ад нямецкага ўрада, новая кааліцыя павінна дзейнічаць і прыняць людзей. Толькі так можна прадухіліць далейшыя смерці на граніцы», — заявіла Аліна Ляпіна, прадстаўнік няўрадавай арганізацыі «Прычал», якая праводзіла акцыю.

Актывісты таксама заклікаюць жыхароў Германіі запальваць у дамах зялёныя агні ў знак таго, што бежанцам могуць дапамагчы. Раней аналагічная акцыя прайшла ў Польшчы: жыхары прыгранічных раёнаў запальвалі ў сваіх дамах зялёныя лямпы ў знак таго, што гаспадары гатовы даць прытулак бежанцам, якія перасякаюць польскую граніцу.

Па словах праваабаронцаў, на граніцах «негасціннай» Еўропы ўжо загінула больш за 17 мігрантаў, а з набліжэннем зімы іх колькасць можа вырасці ў разы.

**Пётр ДУНЬКО.**

## Каб зімаваць спакойна

### Як пазбегнуць крадзяжоў на дачным участку?

**Большасць дачнікаў ужо перабралася ў свае ўтульныя кватэры. Прысядзібныя ўчасткі ў парадку, хаты — на замку. Аднак многіх гаспадароў гэта не супакойвае. Справа ў тым, што іх адсутнасцю карыстаюцца зламыснікі.**

Па выніках 10 месяцаў гэтага года ў краіне адзначаецца зніжэнне колькасці крадзяжоў (з 1135 да 793 летась), здзейсненых з домаўладанняў грамадзян, размешчаных у садовых таварыствах і дачных кааператывах. Падазраваны ў здзейсненых злачынствах устаноўлены ў 431 выпадку.

— Для захаванасці сваіх домаўладанняў і маёмасці, якая ў іх знаходзіцца, надзвычай важна прымаць комплексныя меры, — адзначыў **начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Вадзім ПЕТЫШ.** — Яны актуальныя як напярэдадні закачэння дачнага сезона, так і ў перыяд масавых наведванняў дач, таму што большасць грамадзян прысутнічае ў сваіх домаўладаннях толькі ў выхадныя дні. Своечасовае прыняцце мер дапаможа грамадзянам не толькі абараніць маёмасць ад злачынных замахаў, але і ў выпадку здзяйснення правапарушэння прыцягнуць вінаўніка да вызначанай заканадаўствам адказнасці.

**Каб абараніць свой дом, міліцыя рэкамендуе:**

— устанавіце надзейныя ўваходныя дзверы і замкі, умацуйце аконныя праёмы;

— заўсёды правярайце, што ўсе дзверы і вокны ў хаце зачынены (нават калі выходзіце на непрацяглы час);

— ключы ад хаты не хавайце ў лёгкадаступным месцы;

— не пакідайце ў дачным доме ў перыяд міжсезоння (або ў перыяд працяглай адсутнасці) каштоўныя рэчы;

— усталюйце добрасуседскія адносіны з хазярамі свайго садовага таварыства (дачнага кааператыва) з мэтай узаемнага назірання за домаўладаннямі адно аднаго;

— пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці ўстанавіце ахоўную сігналізацыю і не забывайцеся яе ўключаць;

— інфармуйце органы ўнутраных спраў аб фактах з'яўлення (пражывання) старонніх асоб на тэрыторыі садовага таварыства (дачнага кааператыва) або транспартных сродкаў, якія выклікаюць падазрэнне, а таксама правапарушэннях, што адбыліся.

**Вераніка КАНЮТА.**

# НА ВАРЦЕ ІНТАРЭСАЎ ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ

## Выданне Міністэрства ўнутраных спраў «На страже» адзначыла 90-годдзе

**Пачынаючы з 12 лістапада 1931 года газета скрупулёзна вядзе летапіс беларускай міліцыі, расказвае аб людзях у пагонах, якія шчыра і добрасумленна нясуць службу па ахове грамадскага парадку, забяспечваючы мірнае жыццё мільёнам беларусаў. Чаму газета цікавая не толькі для тых, хто працуе ў міліцыі, якімі эксклюзіўнымі магчымасцямі валодаюць ведамасныя журналісты і як выданню ўдаецца не толькі трымацца на плаву ў век інфармацыйных тэхналогій, а яшчэ і павышаць свой тыраж, карэспандэнту «Звязды» расказаў галоўны рэдактар газеты «На страже» Яўген САЧАК.**

***— Яўген Сяргеевіч, у якіх умовах стваралася галоўнае выданне беларускай міліцыі?***

— Станаўленне міліцэйскай газеты як паўнавартаснага перыядычнага выдання непарыўна звязана з гістарычнымі вехамі не толькі беларускіх органаў унутраных спраў, але і ўсёй краіны. 27 лютага 1930 года Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет Народных Камісараў БССР зацвердзілі новае Палажэнне аб Рабоча-Сялянскай міліцыі і крымінальным вышуку БССР. Для павышэння ўзроўню ідэйна-палітычнай, выхаваўчай і арганізатарскай работы ў асяроддзі вартаўнікоў правапарадку 12 лістапада 1931 года быў выпушчаны першы нумар газеты «На варце Кастрычніка» (на беларускай мове газета выходзіла да Вялікай Айчыннай вайны). Пілотны нумар выйшаў на чатырох палосах тыражом у паўтары тысячы экзэмпляраў. Газета адразу стала аўтарытэтнай і папулярнай у чытачоў. Аб гэтым сведчыў паток лістоў у рэдакцыю і шырокая сетка пазаштатных карэспандэнтаў. Матэрыялы для выдання пісалі ўсе: камандзіры і палітсупрацоўнікі, паставыя міліцыянеры і оперупаўнаважаныя, партыйныя і камсамольскія дзеячы.

***— Сёння «На страже» верная сваім традыцыям: гэта газета пра міліцыянераў. Аднак ці толькі для іх? Хто, акрамя супрацоўнікаў ведамства, яшчэ вас чытае?***

— Наша газета — карпаратыўнае выданне. Таму пераважная большасць падпісчыкаў, а адпаведна і чытачоў, — людзі, якія служаць або працуюць у ведамстве. Невыпадкова асноўныя тэмы, што асвятляем на старонках выдання, так ці інакш звязаны з праваахоўнай дзейнасцю. Дыяпазон даволі шырокі: ад афіцыйных загадаў аб пераходзе на летнюю або зімовую форму адзення да развагаў аб сэнсе службы, стаўленні да прафесіі вопытнага або маладога супрацоўніка, учарашняга курсанта або сталага кіраўніка. Расказваючы аб дзейнасці таго ці іншага міліцыянера, спрабуем знайсці нейкую прафесійную разынку, якая можа быць не толькі цікавая, але і карысная. Напрыклад, не раз чуў меркаванне запраўскіх сышчыкаў аб тым, што іх прыцягваюць публікацыі аб раскрыцці злачынстваў. Здавалася б, сваіх гісторый дастаткова на цэлую газету і не на адну. А як аказалася, з нашага выдання яны не толькі даведваюцца аб практыцы калег, але знаходзяць і бяруць на ўзбраенне пэўныя нюансы. Таму імкнёмся, каб газета была карыснай. Яшчэ адна важная чытацкая катэгорыя — родныя нашых супрацоўнікаў. Газета прыходзіць у сям'ю, таму разумеем, што яна мусіць быць не толькі для таго, хто звязаны з міліцыяй. Публікуем бытавыя парады, шукаем адказы на жыццёвыя пытанні, гаворым пра здароўе, раз на два тыдні выходзіць спецыяльная старонка для маленькіх чытачоў. Не забываемся і пра нашых ветэранаў.

***— А ці наладжана з аўдыторыяй выдання зваротная сувязь?***

— Ужо не першы год праводзім анкетаванне: просім выказацца аб газеце, падказаць цікавую тэму для публікацыі, задаць пытанне, пакінуць прапанову. У пачатку гэтага года правялі ананімнае апытанне з максімальна спрошчанай магчымасцю даслаць нам электронны адказ. Трэба сказаць, што гэта спрацавала: атрымалі каля тысячы прапаноў. Было нямала цікавых, у тым ліку і крытычных, водгукаў. Усё прааналізавалі, вынікамі падзяліліся з чытачамі. Нешта рэалізавалі, штосьці ўзялі на заметку. І цяпер ведамасная газета адкрытая да новых прапаноў і гатова расказваць пра ўсё, што будзе цікава чытачу. Практычна ў кожным нумары мы нагадваем пра спосабы зваротнай сувязі. Дзяліцеся сваімі ідэямі — і мы будзем вам карысныя.

***— Раскажыце, калі ласка, аб вашых спецыялізаваных выпусках...***

— У кожным нумары выходзіць адзін або два спецвыпускі. Прысвечаны яны канкрэтным службам, падраздзяленням, знамянальным датам. Назвы кажуць самі пра сябе: «Імя табе — участковы», «Ідзе патруль па горадзе», «Дарогам — парадак», «Пад знакам савы», «Вучыся, курсант», «Вайсковыя весці», «Злачынства і пакаранне» і іншыя. У межах спецвыпускаў падымаюцца надзённыя пытанні па розных кірунках праваахоўнай дзейнасці, публікуюцца меркаванні спецыялістаў, дзеляцца ўласным вопытам прадстаўнікі той ці іншай службы. Самым запатрабаваным летась чытачы прызналі штомесячны спецвыпуск «Чалавек і Закон» з навінамі аб заканадаўстве і юрыдычнымі пытаннямі. Яно зразумела: наша інфармацыя дапамагае супрацоўнікам лепш арыентавацца ў прававых навацыях.

***— Сучасныя спосабы перадачы інфармацыі ўдасканальваюцца з кожным днём, і друкаваным СМІ за імі складана ўгнацца. Ці ўкараняеце ў сваю выдавецкую дзейнасць трэнды сучаснай журналістыкі?***

— Вядома, сёння газета не можа канкурыраваць з электроннымі крыніцамі інфармацыі ў аператыўнасці. Разлічваем на іншае: даём больш падрабязны і дэталёвы разгляд тэм, якія зацікавілі чытачоў. А вось у іх вызначэнні электронныя масмедыя часам становяцца нам памочнікамі. Грамадскі рэзананс нярэдка падказвае журналісту, якую тэму лепш узяць у распрацоўку. Сюды ж дадаём магчымасці міліцэйскага ведамства ў ацэнцы падзей, іх аналізе, у дабаўленні падрабязнасцяў і нюансаў, у кампетэнтных каментарыях. Таму матэрыял на тэму, якая ўжо, здавалася, асвятлялася з усіх бакоў, можна прыгожа і паўнавартасна дапоўніць. Не трэба забываць і пра тое, што ведамасныя журналісты, натуральна, валодаюць зразумелымі эксклюзіўнымі магчымасцямі атрымання інфармацыі. Не раз нашы публікацыі станавіліся інфармацыйнымі нагодамі, падказвалі тэмы для калег з іншых СМІ, у тым ліку электронных.

***— Хто сёння працуе ў газеце?***

— У гэтым кантэксце, як гаворыцца ў вядомым выказванні, для нашага калектыву характэрны сплаў досведу і маладосці. Гэта аптымальны варыянт. У газеце працуюць і зусім яшчэ маладыя карэспандэнты, а ёсць і аксакалы з салідным журналісцкім багажом. Свядома не называю імёны і прозвішчы, бо трэба будзе пералічыць ледзь не ўсю рэдакцыю. Разам працягваем шукаць новыя сюжэты для матэрыялаў і прыёмы афармлення газетных старонак. Да таго ж і кіраўніцтва ведамства па-добраму стымулюе калектыў. Наша мэта — абапіраючыся на існуючыя традыцыі, не спыняцца ў развіцці. Пастаянныя чытачы заўважаюць змены. У складзе рэдакцыі ёсць афіцэры, але грамадзянскіх спецыялістаў найбольш. Усіх аб'ядноўвае жаданне прагрэсіўна рухацца наперад у творчасці, разам з тым упэўнена стаяць на варце інтарэсаў ведамства і на пазіцыях дзяржавы.

***— Апошнім часам на самых розных пляцоўках падман выдаецца за праўду, насельніцтву навязваюцца псеўдафакты, а людзі часцей вераць блогерам, чым прафесійным журналістам. Чаму, на ваш погляд, так адбываецца і ці трэба з гэтым змагацца?***

— Інфармацыйнае супрацьстаянне, якое абвастрылася на працягу апошніх двух гадоў, стала своеасаблівай лакмусавай паперкай у медыяпрасторы. Журналісты «На страже» не далі засумнявацца сваім чытачам у кампетэнтным і сумленным поглядзе на тое, што адбывалася. Мы не раз былі ў гушчы тых падзей, бачылі ўсё на ўласныя вочы, размаўлялі з калегамі з розных службаў і падраздзяленняў, імкнуліся аб'ектыўна разумець і аналізаваць. Таму нам было нескладана расказваць пра тое, што бачылі, што перажывалі. У апанентаў, лічу, былі першапачаткова дыяметральна супрацьлеглыя мэты, і яны да іх ішлі па вядомых, прапісаных, адпрацаваных методыках падачы інфармацыі, дзе апраўданы любыя сродкі. Безадказна хлусіць і злараднічаць — проста. Разбіраць факты і прапаноўваць нешта канкрэтнае значна складаней. Змагацца трэба праўдай. У ёй сіла. Аб гэтым не раз гаварыў Прэзідэнт нашай краіны. Прыемна адзначыць, што кіраўнік дзяржавы павіншаваў газету з 90-гадовым юбілеем. Гэта высокая ацэнка нашай працы. І яна адпавядае меркаванню чытачоў.

**Вераніка КАНЮТА.**



**Фота з архіва рэдакцыі газеты «На страже».**

Карысныя сустрэчы

# ПРАЦЭС ВЫПРАЎЛЕННЯ — ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАЦЭС

## Што ў папраўчых установах робіцца дзеля таго, каб пасля вызвалення асуджаныя пайшлі па правільным шляху

**«Жыццё пражыць — не поле перайсці. Ніколі нельга ставіць на сабе крыж. Трэба ісці наперад. Усе мы не без граху, усялякае здараецца ў жыцці. Не трэба смуткаваць і дажываць дні. Патрэбна жыць і развіваць душу, якая ёсць у кожнага. І прабачыць сабе, папрасіць прабачэння перад Богам, даравацъ тым, хто нам шкодзіў. Я думаў, што мой лёс — дажываць дні і не псаваць жыццё родным. Упэўнены, і на вас ужо крыж паставілі. Але не! Вы павінны самі сабе сказаць: «Я буду шчаслівы». Нікому не дазваляйце вас зламаць. Ідзіце ў жыццё, да сваёй сям'і і да сваіх будучых дзетак», — з такімі словамі вядомы параалімпіец Аляксей ТАЛАЙ звярнуўся да асуджаных, з якімі сустрэўся ў папраўчай установе № 2 горада Бабруйска.**

Матывацыйны спікер рэгулярна наведвае папраўчыя ўстановы. Яго мэта — не вучыць жыць дарослых людзей, а закрануць іх сэрцы і душы, расказаць, як важна любіць жыццё, нягледзячы ні на што. Ідэя праводзіць падобныя трэнінгі ад Аляксея Талая ў калоніях належыць Дэпартаменту выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

— У сістэме выканання пакаранняў, у цэнтры якой людзі з рознымі лёсамі, неабходна, каб з імі працавалі прадстаўнікі грамадскасці, таму мы запрашаем прадстаўнікоў грамадскай супольнасці, якім давяраюць, — расказвае **начальнік аддзела выхаваўчай работы са спецкантынгентам у папраўчых установах, следчых ізалятарах і лячэбна-працоўных прафілакторыях Дэпартамента выканання пакаранняў МУС падпалкоўнік унутранай службы Дзяніс ПАЎЛЕНКА.** — Важна, каб словы аб патрыятызме, жыцці яны чулі не толькі ад чалавека ў пагонах, але і ад звычайнага грамадзяніна, які сам перажыў складаную жыццёвую сітуацыю і змог яе пераадолець. Асуджаныя павінны бачыць, што нават у найскладанейшых сітуацыях не ўсё страчана.

### Першы крок да новага жыцця

Відэазвіншаванне з Новым годам ад параалімпійца, бізнесмена, члена Канстытуцыйнай камісіі і матывацыйнага спікера, якое летась паказалі ва ўсіх калоніях, выклікала рэзананс сярод асуджаных. І стала ясна: трэба сустракацца асабіста. Першай калоніяй, якую наведаў Аляксей Талай, стала папраўчая ўстанова № 8 у Оршы. Тут адбываюць пакаранне тыя, хто асуджаны неаднаразова.

— Спецыфіка гэтых людзей у тым, што яны любяць сябе шкадаваць, — заўважае Дзяніс Паўленка. — Яны кажуць, што пайшлі на злачынства, таму што не маглі знайсці работу, іх падставілі і гэтак далей. А тут яны бачаць чалавека без рук, без ног, у якога ёсць работа, сям'я. Гэта зараджае ў асуджаных унутраныя супярэчнасці, яны пачынаюць аналізаваць сваё жыццё. Працэс выпраўлення перш за ўсё псіхалагічны. Чалавек павінен сам захацець змяніцца. А калоніі ствараюць для гэтага ўсе ўмовы: людзі тут працуюць, вучацца. Сустрэча з Аляксеем Талаем для некаторых можа стаць першым крокам у жаданні змяніць жыццё.

Дзякуючы Дэпартаменту выканання пакаранняў МУС, карэспандэнт «Звязды» пабывала падчас такіх сустрэч у выхаваўчай і папраўчай установах горада Бабруйска. «Супрацоўнікі калоній адзначаюць, што асуджаныя заўсёды абмяркоўваць такія сустрэчы, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі папраўчага працэсу Дэпартамента выканання пакаранняў МУС палкоўнік унутранай службы Аляксандр КРАЛЬКО.** — Апошнія прызнаюцца, што іх гэта матывуе. Невядома, як бы яны сябе паводзілі, трапіўшы ў такую складаную сітуацыю. Наколькі працуе такая матывацыя — іншае пытанне. У адных яна ўзнікае на найбліжэйшую перспектыву, некаторым такога запалу хапае надоўга. А ёсць і тыя, хто дасягае пэўных поспехаў і сапраўды мяняецца».

### Псіхалагічны выбух

Псіхолагі сцвярджаюць: галоўнае ў матывацыйнай справе — гаварыць людзям тое, што ім блізка і цікава. Аляксей Талай гэта добра ведае. Таму ў сваіх выступленнях закранае самыя розныя тэмы. Дзяніс Паўленка расказвае, што апошнім часам у калоніях зроблены акцэнт на здаровым ладзе жыцця, наладжана інфраструктура, праводзяцца спаборніцтвы. За час адбывання пакарання людзі, якія раней атрымлівалі толькі павесткі ў міліцыю, пачынаюць збіраць кубкі, дыпломы, граматы. Напрыклад, у папраўчай установе № 2 горада Бабруйска асуджаныя ініцыявалі стварэнне спартыўнай залы, распрацавалі эскізы трэнажораў і нават аб'ядналіся ў хакейную каманду.



— Калі Аляксей расказвае ім пра сваю спартыўную кар'еру, яны разумеюць, наколькі спорт важны для жыцця, — удакладняе Дзяніс Паўленка. — Яны бачаць, што чалавек можа сканцэнтраваць у сабе мноства здольнасцяў і развіваць іх. У іх адбываецца своеасаблівы псіхалагічны выбух: чаму чалавек без рук і ног змог, а яны не могуць. Спадзяюся, гэта дапаможа ім і на свабодзе весці нармальны лад жыцця, а не вяртацца на злачынны шлях.

У выступленнях Аляксей робіць акцэнт на сваім дзяцінстве, расказвае, як яго выхоўвалі бацькі, дзядуля. Адзначае, што менавіта іх выхаванне дапамагло перажыць тую катастрофу, якая здарылася з ім у 16 гадоў. «Асуджаныя — як тыя дзеці: усе расповеды Аляксея прапускаюць праз сябе, успамінаюць сваё дзяцінства, якое, магчыма, было падобным да дзяцінства Аляксея, — тлумачыць Аляксандр Кралько. — Яны разважаюць, чаму ён змог узяць сваё жыццё ў рукі, а яны — не. Не ўсе, вядома, так думаюць. Але калі хаця б у часткі асуджаных такія думкі ўзніклі, было б добра».

Зразумела, што адна сустрэча не можа цалкам змяніць светапогляд дарослага чалавека. Аднак Аляксей Талай пастаянна прысутнічае ў жыцці асуджаных.

### Артыкул — не кляймо

— У вачах некаторых асуджаных я бачыў душу: чалавек усвядоміў сваю віну і адчувае пакуты сумлення, — дзеліцца Аляксей Талай. — Мне іх шкада. І я прашу Бога, каб яны выстаялі, вытрымалі і пачалі новае жыццё, знайшлі на гэта сілы. Няхай такія людзі падобныя сітуацыі зробяць мацнейшымі, а не разлуюць на ўвесь свет. Асабліва гэта важна зусім маладым хлопцам, з якімі я сустракаўся ў калоніі для непаўналетніх.

Не ставяць крыж на асуджаных і спецыялісты Дэпартамента выканання пакаранняў МУС. «Нельга меркаваць аб чалавеку толькі па яго злачынстве, — перакананы Дзяніс Паўленка. — Усё індывідуальна, усякае можа здарыцца ў жыцці. Людзі тут самыя розныя. У кожным злачынстве трэба разбірацца». Згаджаецца з ім і Аляксандр Кралько: «Самі па сабе крымінальныя артыкулы — не кляймо. І калі асуджаныя пры дапамозе нашых супрацоўнікаў і людзей, якія іх наведваюць, адкрыюць у сабе нешта добрае і будуць развіваць, вялікая верагоднасць таго, што на свабодзе яны пойдуць па правільнай сцяжынцы. Наша задача — падтрымаць і зрабіць так, каб яны захавалі любоў да свету».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Дэпартамента выканання пакаранняў МУС.**

Будзьце пільныя!

# Як не стаць ахвярай кіберзлачынцаў

## За дзесяць месяцаў такіх правапарушэнняў зарэгістравана на 17,6 % менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года

**Нягледзячы на тое, што колькасць злачынстваў у сферы інфармацыйных тэхналогій апошнім часам знізілася, расслабляцца не варта. Як не трапіць на хітрасці кіберзлачынцаў, абараніць сваю банкаўскую карту і як паводзіць сябе ў сацыяльных сетках і мэсенджарах, расказалі падчас брыфінгу «Дэкада кібербяспекі: лічбавая адукаванасць і процідзеянне віртуальнай злачыннасці», які адбыўся ў Міністэрстве ўнутраных спраў.**

Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення па процідзеянні кіберзлачыннасці крымінальнай міліцыі МУС Андрэй КАВАЛЁЎ,** сёння лічбавая адукаванасць, або чалавечая бестурботнасць, — самая галоўная прычына, па якой нашы грамадзяне становяцца ахвярамі кіберзлачынцаў. «Махлярства з дапамогай сеткі інтэрнэт — найбольш распаўсюджаны від злачынстваў у свеце, — заўважыў палкоўнік міліцыі. — Гэта добра спланаваная, арганізаваная злачыннасць, у якую, на жаль, уцягваюцца нашы непаўналетнія грамадзяне і моладзь. Мы неаднаразова казалі пра такі тэрмін, як лічбавая гігіена. Сёння ёсць неабходнасць увесці і панящце «лічбавае выхаванне». Найбольш падвяргаюцца атакам кіберзлачынцаў непаўналетнія і пенсіянеры. І калі дзеці ледзь не нараджаюцца з тэлефонам у руках, то людзі сталага ўзросту незаўсёды паспяхова і хутка могуць авалодаць гаджэтамі і інфармацыйнымі тэхналогіямі, і гэтым карыстаюцца махляры».

— За апошнія тры гады колькасць кіберзлачынстваў павялічылася ў дзесяць разоў, — заявіў **старшы следчы па асабліва важных справах упраўлення па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і інтэлектуальнай уласнасці Следчага камітэта Іван СУДНІКОВІЧ.** — Аднак мы змагаемся з гэтым ростам тымі ж сіламі, якія і былі. Усё дзякуючы прымяненню сучасных метадаў, удасканаленню заканадаўства, развіццю дзяржаўна-прыватнага партнёрства, аб'яднанню суб'ектаў процідзеяння кіберзлачыннасці не толькі на нацыянальным, а і на міжрэгіянальным, міжнародным узроўнях. Злачынствы, якія сёння фіксуюцца, масавыя злачынствы, трансгранічныя, бо грошы выводзяцца ў іншыя краіны. І атака на нашых грамадзян ідзе адтуль. Задача — спыніць гэта. Праваахоўны блок у супрацоўніцтве з банкаўскім сектарам, інтэрнэт-правайдарамі, мабільнымі аператарамі, іншымі суб'ектамі выпрацавалі комплекс і стратэгію барацьбы з кіберзлачынствамі, якія планамерна рэалізоўваюцца.

На дадзены момант, расказаў следчы, рэалізаваны прынцып «нулявой адказнасці». «Гэта азначае, што калі банк вінаваты ў тым, што вашы даныя атрымалі ўцечку, пасля чаго быў ажыццёўлены крадзеж, банк аддасць грошы пацярпелай асобе, — патлумачыў Іван Суднікович. — Банкі сёння ўкараняюць сур'ёзныя аналітычныя сістэмы, якія дазваляюць выявіць пэўныя нестандартныя паводзіны кліентаў і карыстальнікаў банкаўскіх сістэм для таго, каб убачыць, што карыстальнік рахункам ужо не ўладальнік, а ашуканец, і заблакіраваць або доступ да рахунку, або правядзенне аперацыі. Асноўная прычына злачынстваў — нядбайнасць грамадзян пры рэгістрацыі фінансавых інструментаў, падчас доступу і карыстання імі пры выкананні аперацый, узаемадносіны з махлярамі».

— Максімальна эфектыўна змагацца з такога роду злачынствамі ў цяперашні час толькі мерамі, якія прымаюцца з боку дзяржавы, не атрымаецца, — акцэнтаваў увагу **начальнік упраўлення па процідзеянні кіберзлачыннасці крымінальнай міліцыі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксей НОВАШ.** — Ахвярай кіберзлачынства ў большасці выпадкаў пацярпелая асоба становіцца з-за сваіх бестурботных паводзін. Злачынцы часта мяняюць спосабы, падыходы да нашых грамадзян. Тут варта дакладна разумець: кім бы ні прадстаўляўся чалавек, з якім адбываецца гутарка, у тым ліку анлайн, перадаваць ідэнтыфікацыйныя даныя ні пры якіх абставінах і ўмовах нельга. Калі ўзнікае пытанне з перамяшчэннем і захоўваннем грашовых сродкаў, ёсць банкаўская ўстанова, куды можна заўсёды патэлефанаваць і ўдакладніць любыя пытанні. Пры гэтым супрацоўнік банка не будзе задаваць пытанні, звязаныя з непасрэдным доступам да рахунку, а запросіць чалавека ў банк для вырашэння любога віду пытанняў.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ООО «Фрондера»
## извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Крупский плодоовощной завод»

| № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % (бел. руб.) | № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цеха), площадь 813,6 м$^2$ | 6576,00 | 4 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 м$^2$ | 1068,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 м$^2$ | 348,00 | 5 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина) | 588,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 м$^2$ | 948,00 | 6 | Устройство водоочищающее «Аттол» RFM-16 (б/у, н/раб), инв. № 430129 | 21,00 |
| | | | 7 | Устройство водоочищающее «Аттол» RFM-1820 TET (б/у, н/раб), инв. 430128 | 345,60 |

В отношении лотов 1–5 проводятся пятнадцатые повторные торги. Цена на лоты снижена на 90 %. В отношении лота 6 – шестые повторные торги, в отношении лота 7 – четвертые повторные торги. Цена на лот 6 снижена на 95 %, на лот 7 – на 70 %. Публикация об аукционе по лотам 1–7 ранее размещалась в газете «Звязда» № 128 (29497) от 08.07.2021, стр. 11

Лоты 1–5 расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды до 2102 года

| | |
|---|---|
| **Задаток** | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| **Шаг аукциона** | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **Начало в 10.00 30.11.2021. Окончание в 16.00 13.12.2021** |
| **Дата и время проведения торгов** | **15 декабря 2021 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1127 |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Крупский плодоовощной завод» (Лот №__), проводимом 15.12.2021».

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 10 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней (в отношении лотов 1–5) и в течение 10 (десяти) рабочих дней (в отношении лотов 6, 7) с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней (в отношении лотов 1–5) и не позднее 5 (пяти) рабочих дней (в отношении лотов 6, 7) с даты подписания (заключения) договора. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – +375299999112, Чеслав.

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона.

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |
| **Информация о продавце** | **ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 29 304-59-90)** |

**ГОМЕЛЬСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор торгов) информирует о проведении повторного открытого аукциона с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, по продаже помещения, не относящегося к жилищному фонду, находящегося в собственности Республики Беларусь и принадлежащего на праве хозяйственного ведения Транспортному республиканскому унитарному предприятию «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»**

**Дата проведения аукциона: 14 декабря 2021 г. в 10.00**
**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | **Помещение, не относящееся к жилищному фонду, инв. № 340/D-215796.** Адрес: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, ст. Якимовка, д. 15-5. Назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду. Нежилое изолированное помещение с тамбуром и крыльцом расположено в одноэтажном деревянном здании (жилом доме) с инв. № 340/С-3659, до 1945 года постройки. Общая площадь: 48,7 кв. м. **Начальная цена: одна базовая величина. Задаток: одна базовая величина** |

**Земельный участок** для эксплуатации и обслуживания блокированного жилого дома, в котором расположено помещение, на праве **аренды** площадью **0,1465 га (доля 27/100)** с кадастровым номером **324500000001000844.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Одно из **обязательных условий аукциона:**
- осуществление покупателем предпринимательской деятельности в течение трех лет, начиная не позднее одного года с момента подписания договора купли-продажи, с использованием приобретенного недвижимого имущества;
- реконструкция под жилые помещения в течение двух лет или перевод в жилые помещения в течение года без реконструкции или использования приобретенного недвижимого имущества для ведения личного подсобного хозяйства в течение года с момента подписания договора купли-продажи

**Местонахождение организатора торгов, контакты:**
г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95; +375 29 170-46-47; сайт: www.gino.by, e-mail: gomel@ino.by, auction-gino@gino.by

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 24.11.2021 г. на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора торгов gino.by**

## ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»
**сообщает о проведении 10.01.2022 г. первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:**

1. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-55176, наименование – **квартира № 3**, площадь 48,1 кв. м. Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, п. Садовый, ул. Совхозная, 12-3 – 6 200 белорусских рублей без НДС

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

06.12.2021 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня

1) О внесении и утверждении изменений в устав общества.
2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания: с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата сбора реестра акционеров – 01.12.2021 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 01.12.2021 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 14 декабря 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Ножницы кривошипные НД3318Г (1212), станок заточной 3622Д (1239), выпрямитель сварочный ВД-306 УЗ (1627), ножницы-пресс НА-633 (1630), фрезерный станок 676П (1662), вертикально-сверлильный станок 2С132К (1789), станок долбежный ГД320 (1842), пресс ручной винтовой ПР-1 (2073), станок токарный МК6056 (2339), полуавтомат сварочный СПАР ПДГ 250 (2567), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2583), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2584), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800/SP (2664), станок шлифовальный (2641), установка для аргонно-дуговой сварки УДГУ 351 AC/DC (2642), металлообрабатывающий ленточный станок G5018WA (2720), настольный сверлильный станок Е-1516В/230 (2767), точильно-шлифовальный станок 3Б634 (556), токарно-винторезный станок РТ 492 (1661), фрезерный станок 6К82Ш (2016), плоскошлифовальный станок 3Г71 (497), штабелер РА 1016 (3220) | 21 924,00 | 2 192,40 |

**Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары Полимиз»**, Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Контактный телефон 375 29 655 50 51.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.12.2021 г. в 17.00.**

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ООО «Фрондера»
## извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белгипроторг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Имущество согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/1D5H25LhPrnUpxQK0tYNBrJAJbGTOK81P/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1124,40 | 112,44 | 56,22 |
| 2 | Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1lJrCB6oNF8Sixl8hsgkrP3xlhNs1GyhP/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 440,40 | 44,04 | 22,02 |
| 3 | Имущество согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1Dt7ha5hvzSvBuvywB67OP3jiRdTWYd4-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 400,80 | 40,08 | 20,04 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги

Местонахождение лотов: 220089 г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, ком. 307

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **29 декабря 2021 года в 13.30 (регистрация с 13.00 до 13.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 30 ноября 2021 года по 16.00 27 декабря 2021 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Белгипроторг», проводимых 29.12.2021.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов.

Контактное лицо для осмотра предмета торгов – Андрей, +375293042560.

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Белгипроторг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293489225 (220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, комн. 307, УНП 100026596)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

По палічках

# ВІРТУАЛЬНАЯ АХОВА АСАБІСТЫХ ЗВЕСТАК

## Увайшоў у сілу Закон аб абароне персанальных даных

**Кожны чалавек павінен ведаць, хто, калі, як, з якой мэтай, у якім аб'ёме і навошта працуе з персанальнымі данымі, а таксама мець магчымасць уплываць на гэтыя працэсы. З дадзенай мэтай, а таксама для абароны індывідуальных звестак беларуса, яго правоў і свабод пры апрацоўцы такой інфармацыі, у сярэдзіне лістапада запрацаваў Закон аб абароне персанальных даных і быў створаны Нацыянальны цэнтр абароны персанальных даных. Як працуе і на што прыдатны новы закон, расказалі эксперты.**

### Кансалідацыя нормаў і крыптаграфічная абарона

Закон упершыню кансалідаваў разрозненыя нормы, якія дагэтуль існавалі ў шэрагу нарматыўных актаў, што рэгулявалі абарот персанальных даных, падкрэсліў **Андрэй ГАЕЎ, дырэктар навастворанага Цэнтра:**

*— Усё больш працэсаў, якія адбываюцца ў рэальным жыцці і эканоміцы, пранікае ў віртуальнае асяроддзе. Таму ўзрастае патрэба забеспячэння бяспекі інфармацыі, у тым ліку даных грамадзян. Папярэдні базавы закон, які дагэтуль рэгуляваў адносіны, звязаныя з апрацоўкай персанальных даных, меў пэўныя недахопы. У прыватнасці, не рэгуляваў моманты, звязаныя з інфармацыяй адносна электронных адрасоў, нумароў тэлефонаў і іншымі аспектамі, якія цяпер нарматыўна рэгулююцца.*

Поспех рэалізацыі закона залежыць ад кожнага з нас, бо толькі ў нашых сілах вырашаць, каму і навошта персанальныя даныя прадастаўляць. А Цэнтр зробіць усё магчымае, каб працэсы адбываліся дакладна і сістэмна, паабяцаў яго дырэктар.

Перад Цэнтрам стаяць дзве галоўныя задачы. Першая звязаная з арганізацыяй абароны персанальных даных. Аднак гэта не значыць, што ў Цэнтры будуць сканцэнтраваны ўсе інфармацыйныя рэсурсы. Банкі і базы даных застануцца ва ўласнікаў гэтых сістэм, падкрэсліў Андрэй Гаеў.

*— Аднак праз пытанні, звязаныя з забеспячэннем метадалагічнага суправаджэння, кантролю, праз разгляд скаргаў, якія, магчыма, будуць узнікаць у суб'ектаў персанальных даных, Цэнтр будзе ўплываць на гэтыя працэсы,* — дадаў ён. — *Спачатку ўпор будзе рабіцца на метадалагічнае забеспячэнне і суправаджэнне рэалізацыі ўваходжання ў сілу закона. У кожнага аператара было паўгода, каб забяспечыць рэалізацыю закона на практыцы, таму спасылацца цяпер на тое, што камусьці чагосьці не хапае, — катэгарычна няправільна. Хоць, зрэшты, Цэнтр і яго каманда таксама толькі фарміруюцца, таму мы з разуменнем будзем ставіцца да працэсаў, якія будуць яшчэ патрабаваць вырашэння.*

Арганізацыя адукацыйнага працэсу — другая задача Цэнтра. Установа будзе забяспечваць павышэнне кваліфікацыі па пытаннях абароны персанальных даных. А ад нацыянальнага цэнтра абмену трафікам да яго пяройдуць пытанні па тэмах, звязаных з тэхнічнай і крыптаграфічнай абаронай інфармацыі.

### Пісьмовая згода — устарэлае патрабаванне

Распрацоўка закона пачалася яшчэ ў 2016-м, і стаўленне да яго было неадназначнае, многія арганізацыі дагэтуль успрымаюць яго палажэнні як пэўны цяжар і неабходнасць ускладнення сваёй дзейнасці. І ў пэўнай ступені гэта сапраўды так, заўважыў **Мікалай САВАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела канстытуцыйнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў:**

*— Раней той, хто фізічна кантраляваў звесткі на папяровым носьбіце, адпаведна, кантраляваў і інфармацыю аб сабе. Па меры з'яўлення інфармацыйных сістэм аднойчы ўведзеная ў сістэму інфармацыя магла адначасова адлюстроўвацца ў розных кропках свету, чалавек пераставаў кантраляваць гэтыя звесткі і не ведаў, як, кім і для чаго яны будуць выкарыстоўвацца.*

Раней персанальныя даныя ахоплівалі толькі тую інфармацыю, якая непасрэдна ідэнтыфікавала суб'екта. І гэта ўжо не адпавядае сённяшнім рэаліям, як і тое, што ўся апрацоўка некалі павінна была ажыццяўляцца па пісьмовай згодзе чалавека, калі іншае не было прадугледжана нарматыўнымі актамі. Відавочна, што ў час развіцця інфармацыйных тэхналогій патрабаванне атрымання пісьмовай згоды — вельмі складанае і нават невыканальнае, падкрэсліў спецыяліст:

*— Важны інструмент закона — комплекс правоў, якімі надзяляюцца грамадзяне (дагэтуль іх не было). З аднаго боку, ён дазваляе чалавеку кантраляваць апрацоўку даных аб сабе, а з другога — накладае на арганізацыі пэўныя абавязацельствы, што вымушае іх больш пільна ставіцца да апрацоўкі і ўліку персанальных даных. Законам вызначаны выпадкі, калі апрацоўка магчымая са згоды чалавека ці без яе.*

### Рызыкаарыентаваны падыход і палітыка канфідэнцыяльнасці

Закон рэалізаваў рызыкаарыентаваны падыход, калі дакладныя меры па абароне правоў суб'екта персанальных даных вызначае сам аператар зыходзячы з мэт, для якіх ён апрацоўвае інфармацыю. Такі падыход не зусім характэрны для нашай прававой сістэмы. Але паколькі колькасць аператараў у краіне налічвае сотні тысяч, вызначыць для кожнага з іх вычарпальны пералік мер немагчыма. Аднак створаны шэраг мер, якія павінен рэалізаваць кожны аператар, адзначыў Мікалай Савановіч.

Сярод іх, дарэчы, — прызначэнне спецыяліста, які будзе займацца пытаннямі ўнутранага кантролю за выкананнем заканадаўства, кансультаваць кіраўніка, разглядаць звароты грамадзян. Важная і палітыка канфідэнцыяльнасці падчас апрацоўкі даных, якую павінен вытрымліваць кожны аператар і ў межах якой ён раскрывае звесткі, якія персанальныя даныя, з якой мэтай і на падставе чаго ён апрацоўвае. Такая мера забяспечвае прынцып празрыстасці апрацоўкі персанальных звестак.

*— Яшчэ адна цікавая норма, аналагаў якой няма ў іншых краінах, — абавязак усіх аператараў праводзіць навучанне асоб, упаўнаважаных на ажыццяўленне ўнутранага кантролю, а таксама тых, хто непасрэдна апрацоўвае персанальныя даныя. Такі падыход не дае ім у будучым магчымасці сказаць, быццам яны не ведалі, што нейкім чынам парушылі закон,* — удакладніў спецыяліст.

### Правы доступу, антывірус і рэзерваванне

У рэальным свеце большасць персанальных даных ужо апрацоўваецца ў электронным выглядзе, і нормы, якія прад'яўляе закон да аператараў, з'яўляюцца пэўнай прававой рамкай, што тлумачыць суб'ектам і аператарам, у межах якога тэрміну і з якой мэтай можа адбывацца такая апрацоўка. Аднак каб рэальна абараніць даныя, трэба, каб сістэма адпавядала адэкватным патрабаванням, звярнуў увагу **Сяргей ПАШКОЎСКІ, спецыяліст па кібербяспецы «БелВЭБ-ІТ»:**

*— Такое рэгуляванне ў краіне існуе з 2013 года. І згодна з патрабаваннямі, інфармацыя абмежаванага распаўсюджвання павінна апрацоўвацца ў сістэмах, якія маюць атэставаную сістэму абароны інфармацыі.*

Каб персанальныя даныя чалавека захоўваліся бяспечна, па-першае, у сістэме павінна быць дакладнае размежаванне правоў доступу пэўных работнікаў. Па-другое, у сістэме павінна быць арганізавана адэкватная антывірусная абарона на камп'ютарах і паштовых сэрвісах. Па-трэцяе, аператар павінен вызначыць пералік іншых інфармацыйных сістэм, з якімі ён узаемадзейнічае, аднак якія яму не належаць. Сюды ж адносяцца і пытанні рэзервавання інфармацыі (не хацелася б сутыкнуцца з сітуацыяй, калі праз нейкі збой ці чалавечую памылку аказалася, што нейкая інфармацыя проста перастала існаваць).

*— Наладзіць абарону інфармацыі аператар можа самастойна — або скарыстацца паслугамі кампаніі, якая мае ліцэнзію аператыўна-аналітычнага цэнтра на тэхнічную і крыптаграфічную абарону інфармацыі,* — удакладніў спецыяліст. — *Калі кампанія пажадае размясціць сваю інфармацыйную сістэму ў пэўнага воблачнага правайдара, які з'яўляецца рэзідэнтам Беларусі, працэдура атэстацыі часткова спрашчаецца. У такім выпадку яна зводзіцца, па сутнасці, проста да пераезду і заключэння дагавора. Такая паслуга, пэўна, будзе папулярная сярод сярэдняга і малога бізнесу.*

**Ірына СІДАРОК.**

Надвор'е

## Пахаладае і прысыпле снегам

**У Беларусі на гэтым тыдні пахаладае, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння Беларусь апынецца ў халоднай і ветранай частцы цыклону. Тэмпературны фон пачне апускацца, і ападкі ў асноўным будуць ісці ў выглядзе снегу і мокрага снегу, па поўначы — моцнага. Месцамі мяцеліца. На дарогах будзе галалёдзіца, у асобных раёнах слабы галалёд. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца ўзмацненне заходняга ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 5 да плюс 1 градуса.

У сераду — пахмурна з праясненнямі. Месцамі па краіне, а па паўднёвым захадзе краіны на большай частцы тэрыторыі кароткачасовы снег, мокры снег, у дзённы час па паўднёвым захадзе магчымы дождж. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер будзе заходні чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра ў начны час складзе нуль — мінус 7 градусаў, пры праясненнях да мінус 9. Днём — ад мінус 5 па паўночным усходзе да плюс 4 па паўднёвым захадзе краіны.

У чацвер прагназуецца воблачнае надвор'е. Часам будуць ісці снег, мокры снег і дождж. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні парывісты, днём месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 8 градусаў па паўночным усходзе да плюс 1 па паўднёвым захадзе краіны. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад нуля да 7 градусаў цяпла.

У пятніцу ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца кароткачасовы і мокры снег, па паўднёвым усходзе — мокры снег і дождж, магчымы слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, ноччу па поўначы пры праясненнях да 8 градусаў марозу.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Японія прыпыняе выдачу новых віз з-за сітуацыі з амікрон-штамам

**Японія з 30 лістапада адмяніла паслабленні, якія дзейнічалі менш за месяц, на ўезд для замежных бізнесменаў, студэнтаў і тэхнічных стажораў і зноў прыпыняе выдачу новых віз для грамадзян усіх краін. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на заяву журналістам японскага прэм'ер-міністра Фуміё Кісіды.**

«Каб пазбегнуць горшага варыянту развіцця падзей, з 30 лістапада мы ўводзім забарону на ўезд у краіну па новых візах для грамадзян усіх краін», — сказаў ён. Фуміё Кісіда падкрэсліў, што гэта часовыя меры да высвятлення сітуацыі з новым штамам.

### Былы міністр назваў унутраную прычыну распаду СССР

**Былы міністр замежных спраў Расіі Ігар Іваноў заявіў, што распад СССР адбыўся не з-за знешняй палітыкі, а з-за эканамічных праблем унутры краіны. Такую прычыну ён назваў у інтэрв'ю «Камерсанту».**

Як адзначыў Іваноў, нягледзячы на папулярнасць першага і адзінага прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова, ён страціў народную падтрымку з-за сацыяльна-эканамічнай палітыкі і пустых прылаўкаў.

«Я лічу, што гэта праблемы ўнутраныя, найперш звязаныя з эканомікай. У нас фактычна не быў сфармуляваны, прынамсі, я гэтага не бачыў і не чуў, дакладны план пераходу ад стапрацэнтна цэнтралізаванай савецкай эканомікі да рыначнай. Адбыўся стыхійны абвал, які прывёў да таго, да чаго прывёў», — заявіў экс-кіраўнік МЗС Расіі.

Раней кіраўнік КПРФ Генадзь Зюганаў заклікаў пасадзіць у турму Гарбачова за развал краіны.

### У Каліфарнійскім універсітэце выказалі здагадку, што можа выклікаць «інтэрнэт-апакаліпсіс»

**Магутная ўспышка на Сонцы, верагодна, стане прычынай глабальных збояў і прывядзе да «інтэрнэт-апакаліпсісу», упэўнены спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях з Каліфарнійскага ўніверсітэта Сангіту Абду Джыёці.**



Як лічыць эксперт, спачатку ўрон будзе нанесены не буйным серверам, якія можна абараніць, а падводным кабелям, што з'яўляюцца асновай глабальнай сеткі.

«Верагоднасць — прыкладна адзін раз на сто гадоў. Але за апошнія сто гадоў не было ніводнай такой буры, а значыць, яна яшчэ цалкам можа адбыцца пры нашым жыцці», — падкрэсліў ён.

Каранальны выкід масы складае ўспышку на Сонцы, пры якой зараджаныя часціцы выкідваюцца ў бок Зямлі. Пасля таго як часціцы дасягаюць зямнога магнітнага поля, можа адбыцца геамагнітная бура. Пры гэтым у зоне рызыкі знаходзяцца і кароткахвалевая сувязь, навігацыйныя сістэмы.

Якіх-небудзь тэрмінаў, звязаных з «інтэрнэт-апакаліпсісам», вучоны не прывёў.

# ІНАВАЦЫІ Ў ТАЛЕРЦЫ

## Якія айчынныя прадукты варта пакаштаваць?

**Сусветны трэнд на здаровы спосаб жыцця і правільнае харчаванне патрабуе ад вытворцаў харчовых прадуктаў умення пастаянна змяняцца і абнаўляцца. У модзе адмова ад солі і цукру, арганічныя мяса і гародніна, спалучэнне такіх, здавалася б, несумяшчальных панаццяў, як інавацыйная вытворчасць і вернасць традыцыям. Мы сабралі для вас прадукты-пераможцы Міжнароднага дэгустацыйнага конкурсу якасці харчовай прадукцыі «ПрадЭкспа-2021: Традыцыі. Якасць. Інавацыі» — самае цікавае на айчынным рынку харчавання сёлета.**

Дэгустацыйны конкурс, дарэчы, досыць малады — праводзіцца толькі другі год. Яго арганізатар — Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні.

— Мэты конкурсу — выяўленне найлепшых узораў харчовай прадукцыі і іх вытворцаў, стымуляванне вытворчасці высакаякаснай канкурэнтаздольнай прадукцыі, вызначэнне найноўшых тэндэнцый у развіцці айчыннага рынку харчовай прадукцыі, умацаванне экспартнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь і прасоўванне айчыннай прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках, — тлумачаць арганізатары.

У рамках конкурсу спецыялісты складалі экспертнае меркаванне па наступных групах прадуктаў: хлебабулачныя, мясныя вырабы (у тым ліку з мяса птушкі), малочная прадукцыя і бульбапрадукты, алкагольныя напоі і кандытарскія вырабы.

— Сёлета было разгледжана 313 узораў прадукцыі, — расказвае **намеснік дырэктара РНПЦ НАН па харчаванні Алена МАРГУНОВА.** — З іх 14 бульбапрадуктаў, 42 узоры каньякоў, 8 кандытарскіх вырабаў, 43 мясныя прадукты, 115 малочных і 91 хлебабулачны выраб.

Вытворцам найлепшых прадуктаў спецыялісты ўручылі 41 Гран-пры, 25 залатых медалёў і 15 сярэбраных. І яшчэ — 43 дыпломы (у намінацыях «Адкрыццё года», «Гонар маркі», «Вернасць традыцыям» і г. д.). Аб некаторых з гэтых прадуктаў мы вам і раскажам. Такім чынам, што варта пакаштаваць...

### УРА, САСІСКІ!

Калі ў школьнай сталовай на абед былі сасіскі, у савецкім дзяцінстве гэта заўсёды ўзнімала настрой. З таго часу змянілася многае, але гэта — не. Разнастайныя «затлумленні», звязаныя з харчаваннем, прыйдуць разам з уступленнем у дарослае жыццё: з яслеў і да класа сёмага-восьмага ўсе (ну, ці амаль усе) дзеці любяць сасіскі.

Мясныя прадукты неабходныя і дзецям дашкольнага ўзросту, і школьнікам. Але калі гаворка ідзе пра каўбасныя вырабы, дзецям патрэбныя менавіта дзіцячыя рэцэптуры. Дыетолагі сёння шмат пішуць і кажуць пра тое, што «дарослыя» мясныя паўфабрыкаты (сасіскі і каўбасы) дзецям не падыходзяць. Занадта шмат смакавых дабавак, солі, фасфатаў, тугаплаўкіх тлушчаў і простых вугляводаў плюс адсутнасць вітамінаў і мінералаў. Пры частым ужыванні «дарослых» каўбасных вырабаў дзіця атрымлівае няправільна сфарміраваны смак (натуральнае мяса яму здаецца прэсным), а таксама схільнасць да гіпертаніі і атлусцення. Каўбасныя вырабы, прызначаныя для дзіцячага харчавання, павінны адпавядаць шэрагу строгіх патрабаванняў. Для іх вытворчасці неабходна выкарыстоўваць мяса ад жывёлін, выгадаваных без выкарыстання кармавых антыбіётыкаў, гармонаў, стымулятараў росту. Сасіскі (сардэлькі, каўбаскі і г. д.) для дзяцей не павінны ўтрымліваць смакавых дабавак і празмернай колькасці солі, фарбавальнікаў, кансервантаў, стабілізатараў. Зрабіць такі прадукт не толькі карысным, але яшчэ і прыгожым, і смачным — досыць складаная тэхналагічная задача. Менавіта таму Гран-пры конкурсу «ПрадЭкспа-2021: Традыцыі. Якасць. Інавацыі» былі ўдастоеныя сасіскі «Мацак» вытворчасці ААТ «Гродзенскі мясакамбінат».

— Утрыманне мяса ў гэтых сасісках — 80 %, і гэтае мяса атрымана ад маладых жывёлін, выраблена без прымянення стымулятараў росту, гарманальных прэпаратаў, кармавых антыбіётыкаў і іншых відаў нетрадыцыйных кармавых сродкаў, — тлумачыць Алена Міхайлаўна. — Выраб збалансаваны па суадносінах «бялок—тлушч» у адпаведнасці з запатрабаваннямі дзіцячага арганізма. Сасіскі не змяшчаюць араматызатары, фарбавальнікі, кансерванты, стабілізатары, узмацняльнікі смаку і водару, фасфаты, пякучыя спецыі, цукар. І выгадна адрозніваюцца ад іншых відаў сасісак зніжаным утрыманнем кухоннай солі.

Дарэчы, гэтыя сасіскі зробяць разнастайным ваш рацыён без шкоды для здароўя, нават калі вы даўно выйшлі з дзіцячага ўзросту, дадае спецыяліст.

### МАМІН ВЫБАР

Трэба адзначыць, што сёлета конкурс прайшоў пад знакам увагі да мацярынства і дзяцінства. І яшчэ адно яго Гран-пры заваяваў Маладзечанскі хлебазавод — за збожжавы хлеб «Мамін выбар». Акрамя таго, гэты хлеб атрымаў дыплом якасці ў намінацыі «Найлепшы інавацыйны прадукт» за асваенне тэхналогіі вытворчасці хлебабулачных вырабаў, прызначаных для харчавання цяжарных і кормячых жанчын.

Цяжарным і жанчынам, што кормяць дзіця, варта клапаціцца пра сваё харчаванне з самай пільнай увагай, падкрэсліваюць медыкі. І хлеб у іх рацыёне — вельмі неадназначны прадукт. З аднаго боку, ён пастаўляе ў арганізм цэлы шэраг неабходных вітамінаў і мікраэлементаў, з другога — занадта каларыйны, перагружае стрававальную сістэму, можа змяшчаць лішак солі, цукар, кансерванты. Таму цяжарным хлеб патрэбны, але «правільны»: збожжавыя гатункі. Для вытворчасці збожжавага хлеба з зерня пшаніцы і жыта выкарыстоўваецца арыгінальная тэхналогія. Перш за ўсё, збожжа прарошчваюць (і на гэтым этапе яно набывае найбольш высокую пажыўную каштоўнасць). Пасля здрабняюць у гаючую муку: хлеб з яе змяшчае амаль у два разы больш, чым звычайны, бялкоў і вітамінаў і практычна ўсе неабходныя чалавеку амінакіслоты. Акрамя таго, збожжавы хлеб утрымлівае харчовыя валокны, якія нармалізуюць работу кішэчніка і выводзяць з арганізма солі цяжкіх металаў і нітраты.

— Хлеб, які перамог, вызначаецца нізкім утрыманнем цукроў (масавая доля цукру не большая за 5 %), нізкім утрыманнем натрыю (не больш за 0,12 г/100 г); нізкім глікемічным індэксам. Гэта крыніца харчовага валакна (утрыманне харчовых валокнаў не менш як 3 г на 100 г прадукту), а ўтрыманне ў 100 г насычаных тлустых кіслот складае 0,36 г, — расказвае спецыяліст.

Пакаштаваць такі хлеб варта не толькі маладым мамам, але і абсалютна ўсім, хто клапоціцца аб правільным харчаванні, сваім і сваёй сям'і. Прадукт дадасць новыя ноткі смаку ў ваша меню, забяспечыць арганізм карыснымі рэчывамі і не сапсуе фігуру. Бо здаровы спосаб жыцця — не падстава адмаўляцца ад хлеба!

### ЗЕФІР ЯК СІМВАЛ

Бабруйскі зефір — адзін з кулінарных сімвалаў Беларусі, і менавіта яго смак звыклы, знаёмы, напэўна, кожнаму жыхару нашай краіны з дзяцінства. Яго не зблытаеш ні з адным іншым. А яшчэ зефір — неверагодна карысны натуральны прадукт. Бо ён вырабляецца з мясцовых сартоў яблыкаў і яго класічная рэцэптура — гэта толькі натуральныя і вельмі карысныя інгрэдыенты. Ласунак паніжае колькасць халестэрыну ў сасудах, выводзіць з арганізма таксічныя рэчывы, павышае ўзровень супраціўляльнасці арганізма розным захворванням. Пры гэтым, нягледзячы на мадэрнізацыю, глабальна тэхналогія вытворчасці бабруйскага зефіру не змянялася вось ужо больш за паўстагоддзя. І менавіта гэтаму прадукту журы аддало дыплом якасці «Вернасць традыцыям».

— Гэта класічны зефір з мясцовых сартоў яблыкаў, унікальная тэхналогія вытворчасці якога на ААТ «Чырвоны харчавік» захоўваецца і да сення, — кажа Алена Маргунова.

Для вытворчасці гэтага зефіру выкарыстоўваюцца толькі кіслыя сарты яблыкаў — у асноўным антонаўкі. Акрамя яблычнага пюрэ, у складзе — цукар, патака, пекцін і яечны бялок. Часам у некаторыя гатункі дадаюцца лясныя ягады. І ніякіх штучных дабавак. Пекцін — гэта натуральны прыродны загушчальнік (поліцукрыд, які змяшчаецца ў ягадах і садавіне), ён нармалізуе страваванне і чысціць арганізм ад таксінаў. Гэта ідэальны пачастунак для ласуноў-прыхільнікаў правільнага харчавання, адзначае спецыяліст.



9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на получение приза переходит к Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный победитель № 1 при наличии оснований для выдачи ему приза уведомляется о выигрыше по телефону и SMS не позднее 28 января 2022 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 1, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 3 февраля 2022 г. включительно предоставить Организатору документ, подтверждающий личность, предусмотренный в п. 9.2. Правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза Альтернативному победителю № 1 производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 202 в срок не позднее 8 февраля 2022 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 1 не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на получение приза переходит к Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный победитель № 2 уведомляется о выигрыше по телефону и SMS не позднее 14 февраля 2022 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 17 февраля 2022 г. включительно предоставить Организатору документ, подтверждающий личность, предусмотренный в п. 9.2. Правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза Альтернативному победителю № 2 производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 202 в срок не позднее 21 февраля 2022 г. включительно.

9.8. Альтернативный победитель № 2 утрачивает право на получение приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче ему приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если победитель (соответственно Альтернативный победитель № 1 или Альтернативный победитель № 2) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (соответственно Альтернативного победителя № 1 или Альтернативного победителя № 2), своего паспорта либо вида на жительство и надлежащим образом заверенной доверенности от победителя (соответственно Альтернативного победителя № 1 или Альтернативного победителя № 2).

9.10. С момента передачи приза к победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или Альтернативному победителю № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости приза не производится. Победитель (соответственно, Альтернативный победитель № 1 или Альтернативный победитель № 2) в случае его нежелания получить приз не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче приза Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств приза. Вручение приза осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или Альтернативному победителю № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

9.13. Участник Игры, претендующий на получение приза, должен заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для выдачи приза.

**10. Иные условия**

10.1. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.2. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

10.3. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда».

10.4. Сведения о результатах проведения Игры публикуются не позднее 21 февраля 2022 г. в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры: + 375 29 678 94 39 работает в период проведения Игры круглосуточно без выходных.

*Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4113 от 24.11.2021 года, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

## ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении 10.12.2021 г. в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:**
https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/11/spisok-imushhestva-rsp12-na-torgi-10.12.21.pdf

**Местонахождение имущества:** Гродненская область, Кореличский район., г. п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «РСП-12».

Тел. +375 29 366 75 68.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375 29 608 31 00; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **09.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 30.11.21** по **17.00 09.12.21** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор: по лотам № 39, 99, 108 – **3 %** от цены реализации предмета торгов; по лотам № 42, 44 – **5 %** от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – **7 %** от цены реализации предмета торгов.

**Срок подписания договора купли-продажи:** в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Срок и порядок оплаты (условия оплаты):** в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

## ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234), объявляет о проведении 30.12.2021 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

| № | Наименование имущества (предмет торгов) | Начальная стоимость, бел. руб. (без НДС) | Минимальная цена, бел. руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|
| 1 | Столярный цех, 130/С-25922<br>Бытовые помещения 130/С-25928<br>Склад для временного хранения 130/С-43467 | 189 893,86 | 170 904,47 |
| 2 | Пневмонагреватель BMS Worker №1 Sigma. Инв. 000957 | 15 217,02 | 13 695,32 |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

**Продавец:** УП «Пинская СПМК-5».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; тел. +375 29 608 31 00; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 5 % от начальной стоимости лота не позднее **29.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **30.11.21 г.** по 17.00 **29.12.21 г.** на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб.; по лоту № 1 – 815,98 бел. руб. за оценку, по лоту № 2 – 69,10 бел. руб. за оценку; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре.

**Срок подписания договора купли-продажи:** в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Срок оплаты по договору купли-продажи:** в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения электронных торгов.

Вернісаж

# ЗОРНЫ СВІТАНАК

**У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася літаратурна-дакументальная выстаўка «Залатая раніца беларускага адраджэння», прысвечаная гістарычнаму перыяду, знакаваму для гісторыі, літаратуры, адукацыі і культуры Беларусі.**

125-годдзе Кандрата Крапівы, Майсея Кульбака, Міхася Чарота; 135-годдзе Змітрака Бядулі, 120-годдзе Міхася Зарэцкага і Віталя Вольскага, 115-годдзе Андрэя Александровіча і Алеся Салагуба, 110-годдзе Юлія Таўбіна... Гэты год аказаўся багаты на юбілеі. Супрацоўнікі музея зрабілі шмат для таго, каб ушанаваць імёны нашых творцаў. Ладзіліся шматлікія выстаўкі, у найбольш неспрыяльны эпідэмічны перыяд — віртуальныя. Адкрываліся новыя факты, збіраліся ўнікальныя фотаздымкі і дакументы.

Новая экспазіцыя — своеасаблівае падвядзенне вынікаў за год, і таму гэта сапраўды важная і адметная падзея ў жыцці горада і краіны. Тым больш што гэтым разам музейшчыкі прапануюць наведвальнікам пазнаёміцца не толькі з жыццём і творчасцю літаратараў, але і здзейсніць падарожжа ў 1920—1930-я гады, якія па праве атрымалі назву «залатой раніцы беларускага адраджэння». Дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей Усік выказаў спадзяванне, што тут кожны наведвальнік зможа адкрыць для сябе нешта новае, пераасэнсаваць і лепш зразумець эпоху, у якой шчыравалі на літаратурнай ніве беларускія класікі.

Невыпадкова на адкрыцці выстаўкі прагучала «Купалінка», створаная паводле беларускага фальклору. Яна ўвайшла ў п'есу «На Купалле», напісаную Міхасём Чаротам. У 1920-я гады падчас спектакляў «Купалінка» прагучала са сцэны больш за 400 разоў. Ёсць на выстаўцы і нотны зборнічак кампазітара Уладзіміра Тэраўскага, які прыдумаў музыку для гэтай песні, а таксама багата працаваў з беларускім фальклорам.

Экспазіцыя дае магчымасць лепш пазнаёміцца з тэатральным жыццём згаданага часу. У 1920-я гады былі створаны чатыры беларускія тэатры, польскі і яўрэйскі. Так, з Беларускага таварыства драмы і камедыі, які збіраўся ў клубе з назвай «Беларуская хатка», «паходзяць» акцёры БДТ-1. У 1926 годзе ў Віцебску запрацаваў БДТ-2, сёння гэта Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. З 1930 года яго дырэктарам быў Віталь Вольскі. З вандроўнай тэатральнай трупы, якую ўзначальваў Уладзіслаў Галубок, вырас БДТ-3, які «асеў» у Гомелі. На жаль, у 1937 годзе тэатр быў расфарміраваны.

На выстаўцы можна пагладзець старыя публікацыі, прысвечаныя культурнаму жыццю таго часу. На экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы з фонду музея, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, выкарыстаны электронныя копіі часопісаў з Нацыянальнай бібліятэкі.

20-я гады мінулага стагоддзя адзначыліся неверагодным уздымам на ўсіх культурных і адукацыйных франтах. Была створана Навукова-тэрміналагічная камісія, у склад якой увайшлі Янка Купала, Сцяпан Некрашэвіч, Язэп Лёсік, Уладзіслаў Чаржынскі, Мікола Шчакаціхін. Была распрацавана тэрміналогія для асноўных галін ведаў.



У 1922 годзе створаны Інстытут беларускай культуры. Пры ім працавала цэнтральнае бюро краязнаўства, якое выдавала штомесячнік «Наш край», дзе друкаваліся цікавыя артыкулы, даследаванні па гісторыі Беларусі, этнаграфічныя знаходкі. Запрацавалі новыя навучальныя ўстановы. Выходзіла шмат падручнікаў, слоўнікаў на беларускай мове. Некаторыя з іх таксама пададзены ў музейнай экспазіцыі. Тут можна нават сустрэць буквар для дарослых і слоўнік для ваенных.

І, вядома ж, выстаўка знаёміць з выданнямі і рэчамі пісьменнікаў, якіх багата прыйшло ў літаратуру ў 1920-х гадах. Сярод іх лямпа з хаты сваякоў Міхася Зарэцкага ў вёсцы Новае Сяло Талачынскага раёна, дзе пісьменнік часта бываў і, як запэўніваюць сваякі, менавіта пад гэтай лямпай пісаў «Вязьмо». Таксама тут можна ўбачыць альбом, які належаў Міхасю Чароту, ці ракавінку, якую ён прывёз са свайго адпачынку, ручнік, вытканы рукамі яго маці. Каштоўныя фотаздымкі вяртаюць нам памяць пра творчую моладзь «залатой раніцы», хоць, на жаль, дакументаў і сведчанняў пра культурныя дасягненні таго часу з-за гістарычных падзей, якія адбыліся ў далейшыя дзесяцігоддзі, засталося вельмі мала.



І да гэтага часу мы мала ведаем пра творчасць пісьменнікаў таго перыяду. Як заўважыў вядучы навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX—XXI стагоддзяў Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Анатоль Трафімчык, літаратура доўгі час замоўчвалася, сёння яна даследавана мала, і навукоўцы кожны год працягваюць адкрываць унікальныя рэчы. Матэрыялы, прадстаўленыя на выстаўцы, колькасна і якасна сведчаць пра творчыя дасягненні, якія Беларусь мела стагоддзе таму. Пра гэта трэба казаць унутры краіны і дэманстраваць як візітоўку нашай культуры ў свеце.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Аб духоўным

# Вытокі дзяржаўнасці і не толькі

## Беларуская праваслаўная царква налета адзначыць 1030-годдзе

**Традыцыйна ў канцы года ў Беларусі праходзяць «Калядныя чытанні». Гэта маштабны царкоўны форум у галіне адукацыі, культуры, сацыяльнага служэння і духоўнай асветы, які праводзіцца ва ўсіх епархіях і экзархатах Рускай праваслаўнай царквы. Заключныя мерапрыемствы ў Маскве збіраюць больш за пяць тысяч удзельнікаў, якія абмяркоўваюць новыя тэндэнцыі і фарматы ў адукацыйных, духоўных працэсах, што адбываюцца ў жыцці грамадства і царквы.**

Беларускія «Калядныя чытанні» заўсёды ўлічваюць спецыфіку нашага рэгіёна. Сёлета яны прайшлі пад назвай «Ад купелі хрышчэння — да вяршынь рэлігійнай думкі: 1030-годдзе заснавання Полацкай епархіі і 200-годдзе з дня нараджэння Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага».

VII Беларускія калядныя чытанні ладзіліся Беларускай праваслаўнай царквой у партнёрстве з міністэрствамі адукацыі, культуры, аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, а таксама з Нацыянальнай акадэміяй навук.

### ПУНКТ АДЛІКУ

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі аб значным юбілеі беларускага праваслаўя гаворыць так:

«Менавіта з праваслаўем звязана станаўленне народа з разрозненых плямёнаў. Праваслаўная вера забяспечыла духоўнае сталенне, вызначыла маральныя асновы народа і ў прынцыпе прадвызначыла гістарычны шлях развіцця. І сёння мы можам з упэўненасцю сказаць, што праваслаўе з'яўляецца асновай нашых каштоўнасных арыенціраў. Ён заўважыў, што, вывучаючы гісторыю Полацкай епархіі, нельга абмінуць асобу князя Уладзіміра. Часта даследчыкі не звяртаюць увагу на духоўныя аспекты асэнсавання таго, што адбывалася з Уладзімірам. Звычайна разглядаюць яго ўчынкі і дзеянні толькі як негатыўныя, хоць такі лад жыцця і паводзіны былі характэрныя для тагачасных насельнікаў нашых земляў. У 988 годзе князь Уладзімір прымае хрышчэнне, пасля чаго моцна мяняецца яго мысленне, і ён пачынае клапаціцца аб тым, каб пашыраць веды на іншых. Пашырэнне праваслаўя на полацкіх землях спрыяла іх развіццю. Змянілася культура чалавечых адносін. Можна сказаць, што ў той час закладваліся духоўныя каштоўнасці народа.

### ГІСТОРЫЯ

Распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях пачалося раней за афіцыйнае хрышчэнне Русі ў 988 годзе. Але, як заўважыў старшыня Сінадальнай гістарычнай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы, протаіерэй Аляксандр Раманчук, на жаль, пісьмовыя крыніцы не ўтрымліваюць пра тое дастатковых сведчанняў, можна толькі гаварыць аб пашырэнні пазіцый хрысціянства на нашых землях з часоў хрышчэння па абрадзе Усходняй Царквы княгіні Вольгі (на думку большасці даследчыкаў — у 957 годзе), пасля чаго на вызначаных ёй месцах пачалі будавацца храмы.

У 1992 годзе пад старшынствам мітрапаліта Філарэта, першага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, адбываліся навуковыя дыспуты на тэму, калі ўсё ж была створана епархія на беларускіх землях. Тады была ўзгоднена дата — 992 год (праз чатыры гады пасля прыняцця хрышчэння князем Уладзімірам). І менавіта ад гэтай даты вядзецца адлік гісторыі праваслаўнай царквы на нашых землях. У 1992 годзе ўрачыста было адзначана яе 1000-годдзе. Але і сучасны юбілей мае вялікае значэнне, бо апошнія 30-годдзе — значны этап у гісторыі развіцця беларускага праваслаўя. У гэтыя гады адбылося адраджэнне царкоўнага жыцця, вяртанне беларусаў да духоўных асноў, якія былі важныя для нашых продкаў. 1030-годдзе — нагода асэнсаваць наноў гістарычны шлях праваслаўя на беларускіх землях і асабліва паразважаць аб працэсах, якія адбываліся на працягу апошніх дзесяцігоддзяў.

Ужо вызначана дата для святкавання юбілею — 7 верасня 2022 года. На працягу года пройдзе шэраг разнастайных мерапрыемстваў: урачыстыя богаслужэнні, хрэсныя хады, круглыя сталы, міжнародныя канферэнцыі з удзелам вучоных Акадэміі навук, асветніцкія акцыі.

### АДУКАЦЫЯ

«На сучасным этапе найбольшую актуальнасць набывае пытанне ўзаемадзеяння царквы і дзяржавы з мэтай павышэння ўвагі агульнаадукацыйнай сістэмы да выхавання высокамаральнай асобы навучэнца, якое павінна быць заснавана на традыцыйных каштоўнасцях нашага народа — на хрысціянстве, — заўважыў старшыня Сінадальнага аддзела па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі Беларускай праваслаўнай царквы, протаіерэй Фёдар Поўны. — Патрыётам немагчыма быць, калі не ведаеш духоўных правілаў свайго народа. Гэта аксіёма. Абстрактна любіць Радзіму — гэта тое ж самае, што любіць усё чалавецтва ўвогуле і нікога канкрэтна». Таму сёлета ў чытанні была дададзена яшчэ адна тэма — супрацоўніцтва царквы з установамі адукацыі. Царква прапануе пазнаёміць дзяцей з агульначалавечымі каштоўнасцямі, якія былі сфарміраваны тысячагоддзі таму, па якіх да гэтага часу, недзе па інерцыі, недзе дзякуючы традыцыі і веры, жыве наша грамадства. Невыпадкова росквіт Полацкага княства прыпадае на часы, звязаныя з прыняццем хрысціянства. Усяго праз сто гадоў пасля заснавання полацкай кафедры ў нашай гісторыі з'явілася такая асоба як Ефрасіння Полацкая — найадукаванейшы чалавек свайго часу, і яе манаскі сан і шчырае служэнне Богу не перашкодзілі ёй быць грамадскім дзеячам і міратворцам, спрыяць асвеце народа. Не трэба забываць, што хрысціянства сфарміравала і матэрыяльную культуру нашага народа. Гэтыя тэзісы закладзены ў школьны факультатыў «Духоўнасць і патрыятызм», створаны па ініцыятыве праваслаўнай царквы з блаславення Экзарха Уладыкі Веніяміна ў супрацоўніцтве са свецкімі спецыялістамі і прадстаўнікамі канфесій, якія з'яўляюцца традыцыйнымі на тэрыторыі краіны. «Гісторыя стварэння Полацкай епархіі сведчыць пра тое, што рэлігійныя погляды на мараль і жыццё ў цэлым маюць вялікае значэнне ў станаўленні нацыянальнай самасвядомасці і вызначаюць вектар развіцця народа. Таму дзецям важна разумець свае духоўныя вытокі», — адзначыў Фёдар Поўны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «ЗОЛАТА «ЛІСТАПАДА» ПАЕДЗЕ Ў ТАШКЕНТ

## Абвешчаны пераможцы Мінскага кінафестывалю

**Завяршыўся XXVII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». Цырымонія закрыцця прайшла ў кінатэатры «Масква». Саветам журы было адзначана шмат стужак, якія ўдзельнічалі ў конкурснай праграме. Больш падрабязна раскажам аб пераможцах.**

— За час работы фестывалю спецыялісты правялі грунтоўную работу: яны не толькі абмяняліся меркаваннямі, падыходамі, але і выпрацавалі напрамкі далейшага супрацоўніцтва. Прыемна адзначыць, што дыскусіі ўвасобіліся ў канкрэтныя дакументы, якія дазволяць нам актыўна развіваць кінематаграфічнае мастацтва, — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** падчас цырымоніі закрыцця.

Спецыяльны прыз Прэзідэнта «За гуманізм і духоўнасць у кіно» Ігар Петрышэнка ўручыў рэжысёру ўзбекскага фільма «Ілхак».

— Журы было няпроста, паколькі трэба было непрадузята і грунтоўна ацаніць работы і быць адзінымі ў ацэнках. Жадаю, каб мы працягвалі любіць і паважаць кіно. Давайце падтрымліваць нашых кінематаграфістаў, ар-




Фота БелТА.

Гран-пры «Золата «Лістапада» ўручаецца за фільм «Ілхак», Узбекістан. Рэжысёр Джахангір Ахмедаў.

тыстаў, усіх тых, хто робіць наша жыццё больш грунтоўным і дынамічным, — дадаў намеснік прэм'ер-міністра.

Падчас цырымоніі было ўручана адразу некалькі спецыяльных прызоў. Фільм «Лётчык» рэжысёра Рэната Даўлецьярава атрымаў прыз Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта за ўвасабленне духоўнасці ў мастацтве. Стужка «Qazaq. Гісторыя аднаго чалавека», створаная з удзелам прадстаўнікоў ЗША і Казахстана, была адзначана Спецыяльным прызам Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Кіно без межаў» за развіццё культурнага супрацоўніцтва і ўмацаванне сяброўства паміж народамі. Рабоце грузінскага рэжысёра «Роварам да Месяца» была прысуджана спецыяльная ўзнагарода «Мова кіно — мова дружбы».

### КІНО МАЛАДЫХ

***Сёлета ў секцыі «Кіно маладых» удзельнічалі 23 работы.***

Найлепшым анімацыйным фільмам была прызнаная аўстралійская стужка «Жывапіс па нумарах» рэжысёра Джэгатхевы Радхэі. Дыплом за шчырасць у асвятленні праблем чалавечай годнасці прысудзілі рабоце французскага рэжысёра Каміра Айноўза «Мядовая цыгара». Дыплом за найлепшую рэжысуру атрымаў Манзаралі Шэралі з Таджыкістана за стужку «Абуза». Спецыяльны прыз журы прысудзілі французскаму фільму «Лулу» рэжысёра Юбера Віля.

За найлепшае ўвасабленне тэмы фестывалю «Кіно — сімфонія адзінства» ўзнагароду атрымаў індыйска-афганістанскі фільм «Ад дзвярэй да дзвярэй». Дыплом за дакладную кінаіронію дастаўся расійскаму рэжысёру Глебу Росу «Белы гетэрасексуальны мужчына». Дыпломам за дзёрзкасць задумы адзначылі кубінскі фільм «Сіняе сэрца». Найлепшым дэбютам стала расійская стужка «Маякоўскі». А прыз за найлепшы фільм конкурсу імя рэжысёра Віктара Турава дастаўся іранскаму фільму «Сын» рэжысёра Нушына Мераджы: гэта гісторыя чалавека, які пасля смерці маці спрабуе наноў выбудаваць свае адносіны са светам.

Гран-пры ў дадзенай секцыі атрымаў расійскі фільм «Далёкі план» рэжысёра Уладзіміра Галаўнёва — тры эпізоды з жыцця расійскай глыбінкі пра з'яўленне 3D-кінатэатраў і лёсы простых людзей.

### ІГРАВОЕ КІНО

***У секцыі ігравога кіно было прадстаўлена 13 карцін.***

Некалькімі прызамі адзначылі нямецка-аўстрыйскую стужку «Каралеўская гульня» рэжысёра Філіпа Шцёльцля, створаную па навэле Стэфана Цвейга. Фільм атрымаў наступныя ўзнагароды: прыз глядацкіх сімпатый за найлепшы гульнявы фільм, прыз за найлепшую аператарскую работу, а таксама прыз за найлепшую мужчынскую ролю.

Сярод лідараў па ўзнагародах вылучылася яшчэ адна стужка, казахстанскага рэжысёра Айжан Касымбек. Фільм «Агонь» атрымаў дыплом за найлепшае музычнае рашэнне і прыз за найлепшую рэжысуру. Лёс героя фільма, простага кур'ера, які спрабуе ў вялікім горадзе будаваць дабрабыт сваёй вялікай сям'і, узрушыў гледачоў.

### ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО

***Кінафестываль падарыў нам 17 стужак у секцыі дакументальнага кіно.***

Адразу некалькі прызоў атрымаў фільм «Страла» беларускага рэжысёра Галіны Адамовіч пра трох жанчын з вясковага ансамбля, якія аднаўляюць старажытны абрад. Стужцы прысудзілі прыз глядацкіх сімпатый за найлепшы дакументальны фільм, а таксама прыз за адлюстраванне гісторыка-культурных і цывілізацыйных кодаў нацыянальнай ідэнтычнасці.

Прыз рэжысёру за найлепшае ўвасабленне вобраза выдатнага дзеяча культуры і мастацтва, які прысвяціў сябе служэнню Айчыне, атрымаў расіянін Антон Нікалаеў за фільм «Іншым я ўжо не буду». Фільм распавядае пра вядомага акцёра, кінарэжысёра, грамадскага дзеяча Нікалая Бурляева. Спецыяльны прыз журы прысудзілі балгарскай стужцы «Ціхая спадчына».

Прыз за найлепшы сцэнарый і прыз журы кінапрэсы прысудзілі іранскаму фільму «Герой» рэжысёра Асгару Фархадзі. Гэтая стужка, дарэчы, сёлета атрымала і Гран-пры журы на Канскім фестывалі.

Спецыяльны прыз журы за жаночую ролю атрымаў французскі фільм «Мая ноч». Яшчэ адзін прыз за найлепшую жаночую ролю атрымала стужка «Ідучы за яе ценем».

Гран-пры «Золата «Лістапада» за найлепшы фільм было прысуджана ўзбекскай стужцы «Ілхак» рэжысёра Джахангіра Ахмедава. Кінакарціна выйшла на экраны ў 2020 годзе і прысвечана 75-годдзю Перамогі ў Другой сусветнай вайне. Мастацкі фільм заснаваны на рэальных падзеях. У ім паказаны боль і пакуты няўцешнай маці Зульфіі Закіравай, якая, у адзіночку выгадаваўшы пяцярых сыноў, страціла іх на вайне. «Ілхак», праект кінастудыі «Узбеккіно», зняты пры падтрымцы Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

**Арына КАРПОВІЧ.**

Дзеля памяці

# Паэт грамадзянскай мужнасці

## Памёр Мікола Мятліцкі

Вось яго кніжная паліца: «Абеліск у жыцце» (серыя «Першая кніга паэта»), «Мой дзень зямны», «Ружа вятроў», «Горкі вырай», «Шлях чалавечы», «Палескі смутак», «Блаславенне», «Няправільныя санкі», «Чаканне сонца», «Бабчын», «Хойніцкі сшытак», «Жыцця глыбінныя віры», «Замкнёны дом», «На беразе маім», «Цяпло буслінага крыла», «Мой боль вырастае да зор»... А яшчэ — кнігі перакладаў твораў паэтаў розных краін і народаў... З кітайскай — дзве грунтоўныя анталогіі: «Пад крыламі дракона: Сто паэтаў Кітая» і «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: Паэты Кітая XX стагоддзя», зборнік вершаў Ай Ціна «Гімн святлу», пераклады ў кнігах «звяздоўскай» серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая».



Яго руплівасці, паэтычнай працаздольнасці можна было заўжды дзівіцца. Хіба гэта не адзнака творчай сталасці — майстэрства працаваць настойліва, паслядоўна рухаючыся да ажыццяўлення галоўнай мэты. Яна — галоўная мэта — была і ў Міколы Мятліцкага: ён ствараў партрэт роднага краю, быў летапісцам роднага Бабчына, роднай постчарнобыльскай Хойніцкай старонкі. На памяці ў многіх і тое, як ён заклікаў у вандроўкі на Гомельшчыну сваіх сяброў — паэтаў, празаікаў, публіцыстаў. Ён жыў усведамленнем таго, што там, у Хойніках, у чарнобыльскіх раёнах Гомельшчыны, нешта трэба зрабіць вартае для людзей. І ў маёй памяці — наша паездка ў Хойнікі, у пярэдадзень Дня беларускага пісьменства ў верасні 2009 года. Утрох — Мікалай Міхайлавіч, рускі паэт Юрый Сапажкоў і я — мы трапілі і ў адселены Бабчын, роднае паселішча Міколы Мятліцкага. Трэба было бачыць слёзы, якімі набрынялі вочы Міколы Міхайлавіча, калі мы падышлі да яго роднай хаты...

Усяляк — сваёй перакладчыцкай працай, увагай да нацыянальных паэзій, найперш постсавецкіх краін — ён выявіў сябе паэтам-інтэрнацыяналістам. Сапраўднай падзеяй для Казахстана стала выданне ў Мінску кнігі легендарнага Абая «Стэпавы прастор» (2010). Былі і прэзентацыі ў Беларусі, Казахстане, кніга падарожнічала па розных міжнародных выстаўках-кірмашах. Гучалі і з вуснаў беларусаў неўміручыя словы Абая: *«О казахі мае! Мой бедны народ! / Жорсткім вусам няголеным прыкрылі рот. / Кроў — на правай шчацэ, а на левай — тлушч.../ Дзе ж тут праўда? Твой розум маўчыць шмат год»...* Чыталі беларусы Абая — і думалі, трымалі ў памяці Купалу, Коласа... Удзячныя казахі адзначылі Міколу Мятліцкага прэстыжнай узнагародай — Міжнародный літаратурнай прэміяй «Алаш».

Асаблівая прага ў Міколы Мятліцкага як перакладчыка была да кітайскай паэзіі. Яе плён — анталогія «Пад крыламі Дракона». А пасля — яшчэ адзін анталагічны том «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы»... І яшчэ праз некаторы час — кніга вершаў Ай Ціна на беларускай мове. *«Вітаючы ранак, зноў галасна певень прапеў. / Ад сонца і месяца далечы свету відны. / Дыск сонца праменіць, і месяц сысці не паспеў. / Ды нетры дрыжаць, і душою валодае гнеў: / Бо зноўку звіняць недалёка сякеры вайны...»*

Напоўнены драматычнымі падзеямі свет падштурхоўваў Міколу Міхайлавіча быць уважлівым да тых нацыянальных паэзій, да тых народаў, дзе сіла выпрабаванняў была роўная драматычнаму лёсу беларусаў, выпрабаванням нашых прашчураў найперш у Вялікую Айчынную вайну... У рукапісе засталася анталогія в'етнамскай паэзіі, над перакладамі, падрыхтоўкай якой да друку Мікола Мятліцкі працаваў некаторы час таму. Будзем спадзявацца, што і гэтая работа ў хуткім часе прыйдзе да друкарскага варштата. Як і іншыя здабыткі таленавітага паэта і перакладчыка. Светлая яму памяць!..

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

**Мікола Мятліцкі не страчваў творчага імпэту да апошніх дзён, працаваў, пісаў новыя вершы, адгукаючыся ў іх на самыя надзённыя праблемы грамадства. Адзін з апошніх яго твораў прысвечаны грамадскаму дзеячу, паралімпійцу Аляксею Талаю.**

Мікола МЯТЛІЦКІ

***Аляксею Талаю***

*У век наш, што на мяжы згубы,*
*Дзе фэйкам раскошна буяць,*
*Можна і сціснуўшы толькі зубы*
*За праўду стаяць.*

*Калі не рукамі, дык сілай волі*
*Перацiскаць гарляк маны,*
*Ісці па жыцці, як па мінным полі*
*Самай бесчалавечнай вайны.*

*Дзяцей, знявечаных снарадамі,*
*Гарнуць душой, не абдымкамі рук.*
*І несці ў кожнае сэрца радасць,*
*Цішачы палахлівы стук.*

*І дзе пралітая кроў святая,*
*Дзе ў наступ не людзі ідуць — звяры,*
*Убачыць, як над Данецкам світае*
*Ранішняя палоска зары.*

*О, мой беларускі мужны краю,*
*Сіротам свету ўсім спагадай,*
*Сыну свайму Аляксею Талаю*
*Новых сіл дай!*

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці былога рэдактара часопіса «Полымя», лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, паэта, перакладчыка МЯТЛІЦКАГА Мікалая Міхайлавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Прэзідыум Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і супрацоўнікі Дома дружбы з глыбокім жалем развітваюцца з выдатным паэтам і чалавекам — Міколам МЯТЛІЦКІМ, які на працягу многіх гадоў служыў беларусам, далучаючы іх да нацыянальнай і сусветнай спадчыны.**

**Выказваем шчырае спачуванне жонцы і сяброўцы паэта — Ірыне Браніславаўне.**

**Прэзідыум БелТД.**

# ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ПРИКОСНИСЬ К БУДУЩЕМУ»

Настоящие правила проведения Рекламной игры «Прикоснись к будущему» (далее – Правила), направленной на стимулирование проведения безналичных платежей держателями платежных карточек Mastercard, Maestro, БЕЛКАРТ-Maestro, БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ-Maestro, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк», разработаны в соответствии с Положением о проведении Рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения Рекламной игры «Прикоснись к будущему» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является ООО «НЭФ корпорэйшн», УНП 193170444. Адрес Организатора: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 3-й этаж, офис 303 (далее – Организатор).

**2. Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, и являющиеся владельцами личных дебетовых карточек Mastercard, Maestro, БЕЛКАРТ-Maestro, БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ-Maestro, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк».

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**3. Определения**

3.1. Карточка – личная дебетовая карточка Mastercard, Maestro, БЕЛКАРТ-Maestro, БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ-Maestro, эмитированная Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк».

3.2. Счет Участника Рекламной игры – банковский счет, доступ к которому обеспечен при использовании личной дебетовой карточки.

3.3. Платежные сервисы — это сервисы Apple Pay, Samsung Pay, Garmin Pay, Fitbit Pay, Xiaomi Pay, Кошелёк Pay, с использованием которых можно совершать платежи в организациях торговли (сервиса).

**4. Название Рекламной игры:** «Прикоснись к будущему».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Дата начала Рекламной игры:** 1 декабря 2021 г.

**7. Дата окончания Рекламной игры:** 14 марта 2022 г.

**8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** Рекламная игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей держателями дебетовых карточек Mastercard, Maestro, БЕЛКАРТ-Maestro, БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ-Maestro, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк»» (далее – безналичная операция).

**9. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств и имущества Организатора в размере 201 718,87 (двести одна тысяча семьсот восемнадцать) белорусских рублей 87 копеек.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 1

| № п/п | Наименование приза | Определение приза | Кол-во | Стоимость с НДС за ед. бел. руб. | ИТОГО стоимость с НДС бел. руб. | Даты и время розыгрышей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Приз 1 | Наушники JBL T660 NC (белый) | 30 | 138,96 | 4168,80 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| 2 | Приз 2 | Наушники JBL Tune 215TWS (зеленый) | 30 | 118,98 | 3569,40 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| 3 | Приз 3 | Умный браслет Samsung Galaxy Watch4 44мм (черный) | 28 | 742,98 | 20803,44 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 88,61 | 2481,08 | |
| 4 | Приз 4 | Беспроводная колонка Sony SRS-XB33 (черный) | 20 | 378,96 | 7579,20 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 34,21 | 684,20 | |
| 5 | Приз 5 | Виниловый проигрыватель Sony PS-LX310BT | 1 | 777,00 | 777,00 | 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 93,69 | 93,69 | |
| 6 | Приз 6 | Беспроводная колонка Яндекс Станция (серебристый) YNDX-0001S | 20 | 435,00 | 8700,00 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 42,59 | 851,80 | |
| 7 | Приз 7 | Ноутбук HP ENVY x360 Convert 15-eu0005ur 435K6EA | 5 | 2989,98 | 14949,90 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 424,36 | 2121,80 | |
| 8 | Приз 8 | Саундбар LG SN5R | 12 | 975,00 | 11700,00 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 123,28 | 1479,36 | |
| 9 | Приз 9 | Вокальная система Sennheiser XSW 1-835-A | 4 | 845,00 | 3380,02 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 103,85 | 415,40 | |
| 10 | Приз 10 | Смартфон Xiaomi 11 Lite 5G NE 6GB/128GB международная версия (черный жемчуг) | 44 | 1089,96 | 47958,24 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 140,45 | 6179,80 | |
| 11 | Приз 11 | Смартфон Samsung Galaxy A52 SM-A525F/DS 4GB/128GB (Черный) SM-A525FZKDSER | 20 | 1029,96 | 20599,20 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 131,49 | 2629,80 | |
| 12 | Приз 12 | Умный браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (международная версия) BHR4951GL | 80 | 117,00 | 9360,00 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| 13 | Приз 13 | Планшет Lenovo Tab P11 TB-J606L 128GB LTE ZA7S0052UA (темно-серый) | 22 | 900,00 | 19800,00 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |
| | | Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога | | 112,07 | 2465,54 | |
| 14 | Приз 14 | ПО Яндекс Плюс 12 мес. (электронные коды доступа к годовой подписке Яндекс Плюс) | 140 | 64,08 | 8971,20 | 20.12.2021 в 14.00; 03.01.2022 в 14.00; 17.01.2022 в 14.00; 10.02.2022 в 14.00 |

**10. Порядок участия в Рекламной игре:**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 01.12.2021 по 31.01.2022:

10.1. Пройти регистрацию на сайте belarusbank-future.by (далее – Сайт) и получить доступ в личный кабинет. Зарегистрировать личный кабинет может только владелец Счета, доступ к которому обеспечен с использованием Карточки.

10.1.1. Для прохождения регистрации Участник должен на сайте ввести в соответствующие поля:

• номер телефона Участника в международном формате;

• фамилию, имя и отчество (при наличии) Участника на русском языке (согласно документу, удостоверяющему личность).

После заполнения указанных полей Участник получает посредством SMS-сообщения код для входа в личный кабинет на сайте. Код для входа в личный кабинет, сообщаемый посредством SMS-сообщения, Участнику необходимо сохранить до окончания Рекламной игры.

10.1.2. В случае если информация об Участнике полностью соответствует информации в базе данных банка, Участник автоматически получит уведомление об успешном прохождении регистрации в личном кабинете на сайте не позднее 5 рабочих дней после создания личного кабинета.

В случае если информация об Участнике не соответствует данным банка, Участник также получит соответствующее уведомление в личном кабинете на сайте не позднее 7 рабочих дней после создания личного кабинета. В таком случае Участнику необходимо обратиться в учреждение банка, где была оформлена банковская платежная карточка, для обновления данных и последующей возможности регистрации. Срок обновления данных банком – до 5 рабочих дней, следующих за днем обращения.

После получения Участником уведомления об успешном прохождении регистрации на сайте, Участнику доступен личный кабинет на сайте. Участник может зарегистрировать только один личный кабинет за период Рекламной игры.

10.1.3. В случае попытки регистрации Участником одного и того же номера телефона дважды или более раз, повторные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

10.2. Быть пользователем Платежного сервиса и иметь техническую возможность совершения платежей Карточками с использованием Платежных сервисов.

10.3. Осуществить в период с 01.12.2021 по 31.01.2022 безналичные операции по оплате товаров, работ, услуг в организациях торговли (сервиса) в белорусских рублях на сумму не менее 0,80 бел.руб. с использованием Платежных сервисов, которые обеспечивают доступ к Карточкам в любой валюте счета (далее – Безналичная транзакция).

10.3.1. Не является основанием для участия в Рекламной игре осуществление следующих операций:

- безналичные операции, совершенные до 01.12.2021 и после 31.01.2022;

- безналичные операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;

- безналичные операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

- безналичные операции, совершенные посредством банкоматов, инфокиосков, М-банкинга, Интернет-банкинга, в кассах отделений банка;

- безналичные операции по почтовым услугам (в том числе РУП «Белпочта»);

- любые платежи в пользу страховых компаний, финансовых и брокерских услуг;

- безналичные операции, связанные с азартными играми (включая операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через интернет);

- четвертая и последующие безналичные операции, совершенные участником Рекламной игры в одном и том же терминальном устройстве организации торговли (сервиса) в течение одних суток;

- безналичные операции, совершенные без использования Платежного сервиса;

- безналичные операции, по которым в течение периода участия в Рекламной игре совершены возвраты.

10.4. Для участия в розыгрыше конкретного Приза (согласно п. 9 Правил) Участнику Рекламной игры необходимо накопить минимум 7 Безналичных транзакций. За каждые 7 Безналичных транзакций Участнику начисляется 1 Шанс. Безналичные транзакции отображаются в Личном кабинете участника на 8-е сутки после совершения Безналичной транзакции. Начисление Шансов Участникам Рекламной игры, успешно прошедшим процедуру регистрации, производится по безналичным операциям, совершенным с даты начала Рекламной игры.

10.5. Выбрать любой Приз в ближайшем розыгрыше на сайте из перечня Призов (п. 9 Правил) путем зачисления накопленных Шансов (для участия в розыгрыше любого Приза необходимо зачислить 1 Шанс). Выбор Приза должен быть сделан не позднее 23 часов 59 минут 59 секунд дня, предшествующего дню ближайшего розыгрыша на момент выбора Приза розыгрыша приза.

10.6. После зачисления Шанса Участнику и выбора им Приза, в розыгрыше которого он может принять участие, Участнику присваивается Игровой код (1 Шанс = 1 Игровой код).

Игровые коды последовательно присваиваются Участникам следующим образом:

